ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 293 (3401) Панядзелак 23 сьнежня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд.: Менск, Інтэрнацыянал, 65
ЧЫТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАННЯ (III)
Телефоны: рэдактар—1774, [illegible]—817, [illegible]—731

РАДЫЁ У ГАДЗ. НОЧЫ:

Барталь фармуе габінэт

ВАРШАВА, 22. Барталь паведамлены аб тым, што прэзыдэнт запрапанаваў яму фармаваньне габінэту. Прэзыдэнт зьвярнуўся да былога прэм'ера Сьвітальскага з падзякаю за тое, што „ен цьвёрда трымаўся на пасту ў цяжкі момант, калі ўрадавы крызіс мог абярнуцца ў агульны ўнутраны крызіс"

ЗНОШНІ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Арганізуецца моцны ільнаводны саўгас

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). На абшарах Бешанкавіцкага і Сеньненскага раёнаў у вадазборы р. Крывіна арганізуецца саўгас на плошчы 7.200 гэктараў з ільнаводным ухілам Уся праца па арганізацыі саўгасаў будзе скончана да пачатку веснавой пасеўнай кампаніі

Пяцідзесяцігодзьдзе тав. СТАЛІНА

Мільённыя масы пралетараў могуць быць упэўнены ў тым, што Цэнтральны Камітэт бальшавіцкай партыі, які мае ў сваіх радох такога кіраўніка, як тав. Сталін, давядзе краіну да поўнай пабудовы сацыялізму і перамогі пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце

Вітаюць правадыра рэвалюцыйнага пралетарыяту

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і СПА

МАСКВА, 21. На працягу больш 3-х дзесяцігодзьдзяў тав. Сталін, паплечнік Леніна і яго самы пасьлядоўны вучань ствіць на перадавых пазыцыях бальшавіцкае партыі. Вялізарны заслугі тав. Сталіна ў справе згуртаваньня камуністычнае партыі і арганізацыі рабочае клясы ў барацьбе за ажыцьцяўленьне сацыялізму.

Адзначаючы выдатную ролю т. Сталіна ў пасьлядоўным правядзеньні вучэньня Маркса-Леніна, у барцьбе з усякімі дробна-буржуазнымі скажэньнямі яго, у арганізацыі задушэньня супраціўленьня клясавых ворагаў пралетарыяту і будаўніцтва сацыялізму ў краіне Саветаў на шляхох да індустрыялізацыі краіны і да аграмаджанае сельскай гаспадаркі,—Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і СПА у дзень 50-годзьдзя са дня нараджэньня Сталіна,—пасылае яму сваё палкае прывітаньне.

Пастанова аб'яднанага сходу СНК і Эканамічнага Савету РСФСР

У дзень 50-годзьдзя Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна Саўнарком і Эканамічны Савет РСФСР перад абліччам народаў Саюзу ССР і працоўнымі нацыямі усяго сьвету лічаць неабходным адзначыць вялізную ролю тав. Сталіна ў Кастрычніцкай рэвалюцыі, будаўніцтве Савецкай улады, у абароне краіны Саветаў ад контр-рэвалюцыі і ў справе кіраўніцтва будаўніцтвам сацыялізму ў нашай краіне. Тав. Сталін на працягу ўсяе свае больш чым 30-гадовай дзейнасьці барацьбіта - рэвалюцыянэра, будучы адным з арганізатараў і буйнейшых правадыроў бальшавіцкае партыі, згуртоўваў рабочую клясу вакол ажыцьцяўленьня вялікіх ідэй Маркса і Леніка, у сучасны гістарычны пэрыяд, выяўленых у генэральнай лініі УсеКП(б), якія заключаюцца ў рашучай перабудове краіны на сацыялістычных пачатках. Цьвёрда, бяз хістаньняў, праводзячы клясавую лінію, вядучы бязьлітасную пасьляховую барацьбу з усімі ўхіламі ад ленінскае лініі партыі, тав. Сталін не адступае ні перад якімі труднасьцямі, якія стаяць на шляху рабочае клясы, як у справе арганізацыі Кастрычніцкае перамогі пралетарыяту, абароны яе заваёў у пэрыяд грамадзянскае вайны, так і пры ажыцьцяўленьні будаўніцтва сацыялізму ў краіне саветаў.

Саўнарком і Эканамічны Савет РСФСР лічаць неабходным асабліва адзначыць вялікую ролю тав. Сталіна ў справе вырашэньня і ажыцьцяўленьня нацыянальнага будаўніцтва РСФСР і ўсяго Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Фарсаванае ажыцьцяўленьне задуманага партыяй пяцігадовага пляну, асабліва ўзмоцненае правядзеньне сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны на базе шырокай электрыфікацыі, першачарговае шырокае будаўніцтва цяжкай прамысловасьці, правядзеньне ў жыцьцё праграмы хуткага разгортваньня галін, якія вырабляюць сродкі вытворчасьці, узмацненьне дыктатуры пралетарыяту, уцягненьне самых шырокіх бядняцка - серадняцкіх сялянскіх мас у справу сацыялістычнае перабудовы вёскі на аснове іх калектывізацыі і будаўніцтва буйных савецкіх гаспадарак, атрымае ўсю паўнату свайго разьвіцьця, дзякуючы ініцыятыве і цьвёрдасьці, праяўленых тав. Сталіным у правядзеньні гэтых задач.

Саўнарком і Эканамічны Савет РСФСР у дзень 50-годзьдзя кіраўніка генэральнай лініі партыі шлюць яму сваё гарачае брацкае прывітаньне.

САВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНЫ САВЕТ РСФСР.

Тав. Молатаў--Сталіну

Далучаю свой голас да пажаданьняў усяе бальшавіцкае партыі: табе, сапраўднаму ленінцу, наперад ісьці на чале слаўнае перамогамі барацьбы рабочае клясы.

Прыяцельскае прывітаньне.

В. МОЛАТАЎ.

Ад брацкіх кампартый

МАСКВА. Прывітаньне атрымана ад Балгарскае кампартыі і камсамолу, ад камсамолу Нямеччыны, ад кампартыі Гота, ад працоўных і кампартыі Турынгіі, ад рэвалюцыйных рабочых заводу Цэйса, ад прыморскіх камуністых Нямеччыны і інш. партыйных і грамадзкіх арганізацый як Савецкага Саюзу, так і іншых краін.

***

БЭРЛІН, 21. Орган Нямецкае кампартыі «Ротэ-Фанэ» публікуе шматлікія прывітальныя тэлеграмы тав. Сталіну.

М. Горкі--Сталіну

МАСКВА, 21. Атрымана наступнае прывітаньне ад Максіма Горкага:

«Сталіну, Крэмль, Масква, Віншую. Моцна паціскаю руку.

ГОРКІ».

Сарэнта.

Аршанскі акругком КП(б)Б

«Саратніку Леніна, сталёваму рэвалюцыянэру - бальшавіку, тэарэтыку і практыку ленінізму, тав. Сталіну, Аршанскі акругком КП(б)Б ад імя камуністых Аршаншчыны шле шчырае бальшавіцкае прывітаньне».

Аршанскі АК КП(б)Б.

Партактыў Смалявіцкай райарганізацыі

«Непахіснаму змагару за адзінства ленінскай партыі Ёсіфу Вісарыёнавічу Сталіну, у дзень твайго 50-ці годзьдзя гарачае бальшавіцкае прывітаньне ад актыву Смалявіцкай арганізацыі КП(б)Б.

Сваёй работай і няўхільнай барацьбой з тымі, хто прабуе рэвізаваць ленінізм, ты тав. Сталін быў і ёсьць і будзеш узорам бальшавіцкай дысцыплінаванасьці і ленінскай непрымірымасьці да ўсіляких ухілаў ад генэральнае лініі партыі».

ЦП саюзу працасьветы

«Прэзыдум цэнтральнага праўленьня саюзу працаўнікоў асьветы Беларусі разам з прафактывам шчыра вітае цябе, дарагі тав. Сталін, — стойкага кіраўніка УсеКП(б), вернага вучня і саратніка Леніна, нястомнага барацьбіта за канчатковую перамогу сацыялізму.

Няхай і надалей на доўгія гады партыя і рабочая клясa будуць мець у тваёй асобе вернага салдата пралетарскай рэвалюцыі.

Няхай жыве Ленінскі ЦК і яго кіраўнік тав. Сталін!»

Будаўнікі Асінбуду

«Таварышу Сталіну, бальшавіку-ленінцу, кіраўніку камуністычнай партыі, стойкаму непахіснаму змагару за ідэйную чыстату і маналітнасьць бальшавіцкіх радоў у дзень 50-годзьдзя ад будаўнікоў Беларускай дзяржаўнай электрычнай станцыі — палкае пралетарскае прывітаньне».

Будаўнікі БЕЛГРЭС імя СТАЛІНА.

Менскі палітэхнікум

«Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч. У дзень твайго 50-годзьдзя камуністыя і камсамольцы Менскага палітэхнікуму шлюць табе — лепшаму саратніку Леніна, нястомнаму змагару за пралетарскую рэвалюцыю — гарачае прывітаньне.

Мы цьвёрда ўпэўнены, што ты і надалей сваёй работай і кіраўнічай дапамогай будзеш паказваць прыклад ленінскай непрымірымасьці і бальшавіцкай дысцыплінаванасьці.

Няхай жыве правадыр УсеКП(б) і рабочае клясы тав. Сталін!»

Камуністычны унівэрсытэт

«Дарагі т. Сталін! У дзень твайго 50-цігодзьдзя партыйны калектыў камуністычнага унівэрсытэту Беларусі імя У. І. Леніна, курсы партыйнага і камсамольскага актыву шлюць табе шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

Твая сталёвая воля і ўпэўненасьць у барацьбе з ворагамі дыктатуры пралетарыяту і ворагамі ленінскай партыі, рашучая барацьба з правымі апартуністымі і прымірэнцамі даюць нам лепшы прыклад бальшавіцкай стойкасьці ў барацьбе за адзінства, маналітнасьць і ленінскую непахіснасьць УсеКП(б).

Мы ўпэўнены, што ты, як і раней, будзеш нам аказваць сваю кіраўнічую дапамогу».

Фрунзаўскі РК ЛКСМБ

«Тав. Сталін! У дзень твайго 50-годзьдзя Фрунзаўская арганізацыя ЛКСМБ шле табе сваё камсамольскае прывітаньне. Пад тваім кіраўніцтвам, перамагаючы труднасьці рэканструкцыйнага пэрыяду, рашуча і бязьлітасна змагаючыся з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі, партыя і камсамол, пры актыўным падтрыманьні і дапамозе рабочае клясы, ідуць да новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай далейшая твая работа забясьпечыць нам новыя перамогі па пабудове сацыялізму!»

Батрацтва Заслаўскага раёну — т. Сталіну

Дарагі таварыш! Канфэрэнцыя батракоў Заслаўскага раёну, Менскае акругі пасылае табе — стойкаму бальшавіку - ленінцу сваё гарачае батрацкае прывітаньне.

Канфэрэнцыя батракоў і адзнаку твайго пяцідзесяцігодзьдзя перадае 17 батракоў у партыю і 16 — у камсамол.

Мопраўская канфэрэнцыя

«Менская гарнізонная Мопраўская канфэрэнцыя вайсковых служачых шле гарачае мопраўскае прывітаньне тав. Сталіну ў дзень яго 50-годзьдзя.

Канфэрэнцыя ўпэўнае цябе, дарагі тав. Сталін, што мы, чырвонаармейцы, моцна трымаем вінтоўку ў сваіх руках і поўнасьцю выканаем ускладзеныя на нас задачы па абароне межаў Савецкага Саюзу».

Вярбоўка 500 рабочых у калгасы ідзе недапушчальна марудна

На радзе прадпрыемстваў яшчэ не абгаворвалася пытаньне аб пасылцы рабочых у калгасы

«Зьвязда» ўжо сыгналізавала аб недапушчальна марудным тэмпе вярбоўкі 500 рабочых у калгасы.

1-га студзеня канчаецца тэрмін вярбоўкі. Але мясцовыя партыйныя, прафэсіянальныя арганізацыі, калгасаюз, каапэрацыя дагэтуль яшчэ не разварушыліся. Выкананьне важнейшай палітычнай дырэктывы зрываецца.

Яшчэ 12 сьнежня ЦСПСБ праверыў, як праходзіць вярбоўка на прадпрыемствах. Праверка паказала, што прафарганізацыі фармальна аднесьліся да гэтай справы.

Прайшло з таго часу ўжо 10 дзён, а зруху няма.

21-га сьнежня інструктары ЦСПСБ зрабілі паўторную праверку 14-ці найбольш буйных прадпрыемстваў. І пры гэтай праверцы выявілася, што нават на такіх буйных прадпрыемствах, як заводы «Дрэваапрацоўшчык», «Чырвоная Зорка», абутковая фабрыка, фабрыка «Чырвоны Тэкстыльшчык» пытаньне аб вярбоўцы не абгаварвалася. Ня лепш і па іншых прадпрыемствах. Практычных вынікаў вярбоўкі ўсё яшчэ няма.

Праверка паказала, што ЦП саюзаў, нізавыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі не растлумачылі рабочым масам палітычнай важнасьці пасылкі 500 рабочых у калгасы. Гэта нытаньне не знаходзіць адлюстраваньня ў рабоце чырвоных куткоў, клюбаў, насьцешгазэтах. Не скарыстоўваюцца абедзеныя перапынкі на прадпрыемствах.

Аб тым, што растлумачальная работа праводзіцца дрэнна, гаворыць той факт, што Менск даў пакуль толькі 21 дабраахвотніка.

А што робіцца на мясцох?

Аб гэтым нічога ня ведаюць ні ЦП прафсаюзаў, ні калгассаюз. Пакуль сувязь абмяжоўваецца толькі ўзаемным абменам пляпамі і зводкамі разверстак без канкрэтных указаньняў, што практычна зроблена. ЦСПСБ мае весткі толькі з адпэй Магілеўскай акругі. Усе іншыя акругі маўчаць. А дырэктыва была разаслана яшчэ 6-га сьнежня.

Ніхто нічога ня ведае і аб курсах вылучэнцаў. Рад арганізацый ня выявіў яшчэ, які ўдзел яны прымаюць у гэтай справе.

У рабоце па вярбоўцы 500 рабочых патрэбен самы рашучы пералом, каб не сарваць выкананьня дырэктывы ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ. Трэба мабілізаваць усю рабочую грамадзкасьць вакол пытаньня вярбоўкі.

Для ўзмацненьня работы ЦСПСБ учора камандыраваў у Гомель, Віцебск, Воршу, Магілеў, Барысаў 6 адказных працаўнікоў, якія прабудуць на мясцох каля тыдню. Белкалгассаюз камандыраваў 4-х працаўнікоў. 24-га сьнежня Белкалгассаюз склікае спэцыяльную нараду па пытаньні аб вярбоўцы рабочых і іх скарыстаньні ў калгасах.

ДЫРЭКТЫЎНЫ ЛІСТ ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ

Учора ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ зьвярнуліся да ўсіх АК КП(б)Б, фракцый акрпрафбюро і ЦП прафсаюзаў з наступным лістом:

— Паводле вестак, што ёсьць у ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ, кампанія па выкананьні дырэктывы ЦК аб вылучэньні 500 рабочых для работы ў калгасах да гэтага часу амаль што не разгарнулася. Гэта пагражае зрывам работы і невыкананьнем яе ў вызначаны тэрмін.

ЦК і ЦСПСБ прапануе АК разам з АПБ разгарнуць кампанію сярод шырокіх мас рабочых па пытаньні аб вярбоўцы рабочых - дабраахвотнікаў для работы ў калгасах.

Пры ўсіх фабзаўмясцкомах, дзе праходзіць вылучэньне рабочых у калгасы, трэба тэрмінова арганізаваць адборачныя камісіі з прадстаўнікоў ячэйкі КП(б)Б, фабзаўмясцкому і шэфтаварыства.

Па Менскай акрузе гэтак работа праводзіцца АК КП(б)Б разам з ЦП прафсаюзаў.

100 ніжагародзкіх рабочых прыяжджаюць на работу ў калгасы БССР

Прафсаюзныя арганізацыі Ніжняга Ноўгараду вылучылі 100 рабочых на пастаянную кіруючую работу ў калгасах БССР. Для арганізацыі прыезду ў БССР ніжагародзкіх рабочых, у Ніжні Ноўгарад выяжджаюць прадстаўнікі Белкалгассаюзу і ЦСПСБ.

Да 1-га студзеня---загатовіць 80 проц. гадавога пляну па ільну

На 21-га сьнежня выканана толькі 53 проц.

У астатнія дзесяць дзён узмоцнім тэмп загатовак

Бядняцка-серадняцкі актыў яшчэ ня прыцягнуты да загатовак

Плян загатовак ільну па БССР на 21-га сьнежня выкананы на 53 проц., а месячны плян — на 70,2 проц.

Наперадзе ідуць: Бабруйская акруга, якая выканала 127 проц. месячнага заданьня, Менская — 93,3 проц., Гомельская — 85,2 проц. і Віцебская— 85,2 проц. Адстаюць, як і раней, Магілеўская акруга, якая выканала 48,5 месячнага заданьня, Мазырская — 48,4 проц., Полацкая — 50,2 проц. і Аршанская — 62,9 проц.

Калі ўлічыць, што згодна пастановы ўраду плян загатовак ільну на 1-га студзеня павінен быць выкананы на 80 проц., становіцца ясным, што выкананьне пляну ў тэрмін знаходзіцца пад нагрозай.

Зусім дрэнна ідзе паступленьне закантрактаванага ільну: ёсьць асобныя кантрактанты, якія яшчэ не прыступілі да выкананьня сваіх абавязкаў па здачы ільну.

Да гэтага часу ў справу ўзмацненьня загатовак ільну яшчэ ня ўцягнуты бядняцка - серадняцкі актыў і наогул грамадзкасьць. Камсамол і прафсаюзы яшчэ ня ўсюды вылучылі брыгады па дапамозе ў загатоўках ільну. У выніку мы маем выпадкі, калі большая частка нават калгасаў і саўгасаў ня здала свайго ільну. Неабходна дабіцца, каб прафсаюзы па мясцох выканалі дырэктыву ЦСПСБ і вылучылі адпаведныя рабочыя брыгады для ўзмацненьня загатовак ільну.

Белпаляводсаюз павінен прыняць рашучыя меры да поўнага спагнаньня закантрактаванага ільну.

Усе арганізацыі павінны ўсьвядоміць, што сьнежань зьяўляецца рашаючым месяцам у загатоўках ільну. Дзесяць дзён сьнежня, якія яшчэ засталіся, павінны быць скарыстаны, каб дабіцца ўзмацненьня тэмпаў паступленьня ільну. Дырэктыва партыі і ўраду аб выкананьні да 1-га студзеня 80 проц. пляну загатовак ільну павінна быць ажыцьцёўлена поўнасьцю.

Вымовы за бязьдзейнасьць і невыкананьне пляну

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Прэзыдыум Полацкага АВК вынес пастанову, у якой канстатуе, што загатоўкі ільну ў акрузе разгортваюцца вельмі дрэнна.

Акрвыканком адзначае, што з боку РВК і загатоўчых арганізацый, ня была разгорнута работа па мабілізацыі грамадзкай думкі вакол пытаньняў загатовак.

Сельсаюз, Калгассаюз і РВК не прынялі мер да арганізацыі здачы ільнувалакна аграмаджаным сэктарам. Да гэтага часу рад калгасаў і арцеляй яшчэ не здалі свайго ільну.

За дрэннае разгортваньне работы па загатоўках ільну праўленьню Сельсаюзу, Лепельскаму, Вушацкаму, Ветрынскаму і Баркавіцкаму РВК абвешчаны вымовы.

Загадчыку Полацкага аддзяленьня Белдзяржгандлю за поўную бязьдзейнасьць загатоўчага апарату, непадрыхтаванасьць яго, зрыў выкананьня пляну загатовак — абвешчана строгая вымова з папярэджаньнем.

Прэзыдыум АВК запрапанаваў райвыканкомам, Сельсаюзу і аддзяленьню Белдзяржгандлю тэрмінова скончыць давядзеньне пляну загатовак да асобных вёсак і кулацкіх гаспадарак, устанавіць строгі нагляд і кантроль за выкананьнем у вызначаныя тэрміны здачы валакна кулацкімі гаспадаркамі.

Акруговая нарада галітгуртко ў і групаводаў БВА

Сёньня заканчвае свае работы акруговая нарада палітгуртко ў і групаводаў БВА, якая адкрылася ў Менску 20-га сьнежня. Нарада абмеркавала рад важнейшых пытаньняў, зьвязаных з практычнымі задачамі ваенна-палітычнай работы часьцей нашае акругі.

Нарада заслухала даклад начальніка палітуправы БВА т. Араштама аб чарговых задачах партпалітработы, даклад начальніка агітпропчасьці Паукра тав. Субоцкага аб падрыхтоўцы кадраў калгасьнікаў і даклад рэдактара газэты «Чырвонаармейская Правда»—т. Абрамава аб сацспаборніцтве ў вайсковых часьцях.

Сёньня пачынаюць працаваць сэкцыі і адбудзецца заключны пленум.

Падрабязныя матар'ялы аб нарадзе будуць даны ў нашай газэце ў заўтрашнім нумары.

Узмоцнім мабілізацыю ўнутраных сродкаў

Ашчадная справа, адна з асноўных крыніц унутранога дзяржкрэдыту, набывае зараз ва ўмовах напружанасьці фінансавага пляну ўсё большае значэньне.

Абмеркаваньне пытаньня аб становішчы ашчаднае справы ў БССР у апошні час у ЦК КП(б)Б выявіла, што

«праца на мабілізацыі срокаў насельніцтва, асабліва на вёсцы, праводзіцца неадвальняюча і адстае ад магчымасьцяй і запатрабаваньняў у сувязі са шпаркім тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва».

1 сапраўды. У той час, калі ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі мы маем за апошні час выкананьне кантрольных лічбаў і недавыкананьне досыць значнае.

Праца па ашчаднай справе дагэтуль **застыла на старых і адсталых формах.** Трэба на гэтым вучастку **перайсьці на новыя формы,** перавесьці ўсю работу на новыя мэтады, узяўшы ўстаноўку на больш шпаркі тэмп. Вось першая асноўная задача, якая пастаўлена перад ашчаднай справай апошні дырэктывай ЦК КП(б)Б.

Пастанова ЦК на пытаньні аб ашчаднай справе канстатуе далей, што «зусім не прыстасавана сетка ашчадных кас да ахопу і абслугоўваньня калгасаў і саўгасаў».

Шпаркі рост сацыялістычнага сэктару вёскі застаў ашчадны апарат адсталым, **непадрыхтаваным і непрыстасаваным да абслугоўваньня гэтага росту.**

Між тым трэба мець на ўвазе, што праз сацыялістычны сэктар, праз арганізаваную масу калгасьнікаў можа быць вырашана задача ахопу ашчадкасамі ўсяго бядняцка-серадняцкага сялянства.

Вось чаму перад ашчадным апаратам паўстае задача неадкладна «перабудавацца на-ходу». Дырэктыва ЦК КП(б)Б прапануе ў **месячны тэрмін перагледзець** існуючую сетку ашчадных кас у напрамку пашырэньня яе і арганізацыі раду кас пры буйных калгасах і саўгасах.

Ясна, што новыя задачы, якія высоўваюцца перад ашчаднай справай, накладаюць у першую чаргу сур'ёзныя абавязкі на самы ашчадны апарат. Актывізацыя работы ўсёй сыстэмы ашчадных кас, пашырэньне работы апарату за сьценамі канцылярыі, наданьне гэтай рабоце сапраўды масавага характару —гэта першае патрабаваньне.

Зразумела (і гэта прыходзіцца яшчэ і яшчэ падкрэсьліваць), што ў **ашчаднай справе апаратным парадкам перапому не дабіцца.** Трэба вырашыць, урэшце, пытаньне аб **стварэньні вакол ашчаднае справы пастаяннага актыву з ліку рабочых, работніц, батрацтва і калгасьнікаў.** Мабілізаваць увагу і актыўнасьць мас **на аказаньне практычнай дапамогі** ашчадкасам—вось дырэктыва ў гэтай галіне. **Трэба знайсьці новыя формы практычнага ўдзелу актыву ў працы.** У гэтых адносінах мае важнае значэньне практыка заключэньня сацдагавору паміж ЦП саюзу сельгаслесрабочых і галоўаашчадкасай, паводле якога саюз узяў на сябе абавязак прыцягнуць у ашчадкасы паўную вызначаную суму сялянскіх укладаў у першым квартале бягучага году. На жаль, трэба канстатаваць, што дагавор да гэтага часу яшчэ не прыцягнуў да сябе тае ўвагі, якой ён заслугоўвае і выкананьне яго ідзе пакуль што слаба. Саюз сельгаспрабочых павінен падцягнуцца і выканаць свае абавязкі, якія ён у парадку сацспаборніцтва ўзяў на сябе.

Акрамя гэтых новых асноўных задач, якія зараз высоўваюцца ў галіне ашчаднай справы—**чарговай задачай зьяўляецца выкананьне ў першым квартале 40 проц. гадавое кантрольнае лічбы па сялянскім сэктары.**

Набліжаецца канец першага кварталу. Між тым, ужо з упэўненасьцю можна канстатаваць **зрыў гэтае палітычнае кампаніі.**

На 10-га сьнежня заданьне па БССР выканана толькі на 50 проц., пры тым па асобных акругах гэты процант зусім недапушчальна нізкі. Улічваючы нездавальняючае выкананьне заданьня ў першым квартале, трэба дабіцца выкананьня ў **другім квартале 80 проц. гадавое кантрольнае лічбы па сялянскім сэктары.**

Трэба зараз-жа **дабіцца рашучага перапому** ў гэтай кампаніі. Трэба мабілізаваць увагу грамадзкасьці на кампаніі па ашчаднай справе.

Больш увагі і больш адказнасьці за выкананьне заданьняў па мабілізацыі зьберажэньняў.

Да ўсіх рабселькораў і рэдкалегій насьценных газэт Магілеўшчыны

Пачаўся агляд—абсьледваньне газэты „Камунар Магілеўшчыны"

Камісія сэктару друку АПА ЦК КП(б)Б і Магілеўскага акругкому КП(б)Б распачала работу на правядзеньні агляду-абсьледваньня газэты «Камунар Магілеўшчыны».

Мэта агляду:

Выявіць, наколькі «Камунар Магілеўшчыны» сапраўды зьяўляецца дапаможнікам камуністычнае партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, у прыватнасьці, у справе перабудаваньня сельскае гаспадаркі, суцэльнае калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Магілеўскае акругі.

Агляд-абсьледваньне павінен сказаць, наколькі пасьпяхова адыграла і адыгрывае сваю ролю газэта «Камунар Магілеўшчыны» у разгортваньні шырокай бязьлітаснай крытыкі і самакрытыкі ўсіх перашкод на шляху пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Агляд-абсьледваньне павінен выявіць, наколькі чула адносіцца газэтае «Камунар Магілеўшчыны» да допісаў рабселькораў, якую газэта вядзе выхаваўчую работу сярод дапісчыкаў.

Агляд-абсьледваньне толькі будзе праведзены з посьпехам, калі ў ім прымуць удзел самыя шырокія масы працоўных—гілеўшчыны, усе рэдкалегіі насьценных газэт разам з іншымі чытачамі газэты «Камунар Магілеўшчыны» прыняць удзел у выяўленьні недахопаў газэты і шляхоў іх зьнішчэньня.

Камісія разам з рэдакцыяй арганізуе на старонках «Камунара Магілеўшчыны» заочны мітынг чытачоў і дапісчыкаў газэты.

Заклікаем рабселькораў і чытачоў газэты «Камунар Магілеўшчыны» прыняць актыўны ўдзел у заочным мітынгу шляхам прысылкі допісаў, заўваг і прапаноў адносна газэты «Камунар Магілеўшчыны».

Камісія асобна зьвяртаецца да ўсіх калгасаў Магілеўшчыны з настойлівай просьбай абгаварыць на сваіх сходах пытаньне, наколькі здавальняюча газэта «Камунар Магілеўшчыны» да гэтага часу асьвятляла і асьвятляе пытаньні, зьвязаныя з калектывізацыяй, і якія канкрэтныя запатрабаваньні высоўваюць перад газэтай калгасьнікі.

Усе гэтыя матар'ялы (ад калгасьнікаў) просьба пасылаць на адрасе гор. Магілеў, Ленінская вул. № 35 АПАД АК КП(б)Б для камісіі на агляд газэты «Камунар Магілеўшчыны»

ПРАВАКАЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Стымсон „працуе"

ПАРЫЖ, 19. Паўнамоцным прадстаўніцтвам СССР у Францыі атрымана нота баўтарскага пасланьніка ў Парыжы аб далучэньні Баўтарыі да ўмяшальнасьці дзяржаў у савецка-кітайскі канфлікт. Даверены ў справах СССР тав. Арэнс вярнуў баўтарскаму пасланьніку гэту ноту разам з лістом. У гэтым лісьце т. Арэнс адзначыў, што з прычыны таго, што паміж Баўтарыяй і СССР ня існуе афіцыйных адносін, поўнамоцнае прадстаўніцтва, ня мае права ні атрымліваць, ні перадаваць ноту баўтарскага ўраду ўраду СССР.

***

Далучэньне Баўтарыі, роўна як і іншых дробных дзяржаў, да ўмяшальнасьці Злучаных Штатаў у савецка-кітайскі канфлікт, зразумела, ня прыходзіцца разглядаць у якасьці самастойнага акту замежнае палітыкі гэтых краін. Гэтыя факты зьяўляюцца толькі довадам таго, што дзяржаўны сакратар Злучаных Штатаў Стымсон працягвае сваю сьмяхотную антысавецкую акцыю, выкарыстоўваючы для гэтае мэты асобныя ўрады. У сучасны момант, пасьля назначэньня кіраўніка і намесьніка кіраўніка К.-Усх. ч., рэкамэндаваных савецкім урадам, калі канфлікт блізкі да свайго заваршэньня, далучэньне да ўмяшальнасьці зьяўляецца з фармальнага боку зусім бессэнсоўным, а фактычна напрыкрытым антысавецкім выступленьнем. Такім чынам, навязваючы сваю волю асобным краінам, амэрыканская дыплёматыя фактычна імкнецца пад прыкрыцьцем пакту Кэлёга паспярыць Савецкі Саюз з іншымі дзяржавамі. Стымсон павінен быў-бы ўявіць сабе тое, што падобная яго палітыка пралетаўляе сабою нішто іншае, як нацкоўваньне адных краін на другія, і што такім чынам да канца выкрываецца крывадушша тых тлумачэньняў, якія былі даны ў пачатку ўмяшальнасьці дзяржаў.

Нам ужо прыходзілася адзначаць, што да акцыі Злучаных Штатаў ахвотней усяго далучаюцца або дзяржавы залежныя несамастойныя, якія выконваюць паказаньні, каторыя ідуць з Вашынгтону, Лёндану, або Парыжу, як Аўстрыя. Фінляндыя, Чэха-Славакія, або дзяржавы, якія ня маюць з СССР ніякіх адносін і асабліва варожыя да яго, як напрыклад, Румынія, Баўгарыя і інш. Цікавей усяго далучэньне да ўмяшальнасьці Злучаных Штатаў Фінляндыі, якая давала ў свой час сваю прыхільнасьць да пакту Кэлёга з тым, што з усіх суседзяй СССР яна адна адмовілася ад падпісаньня Маскоўскага пратаколу аб датэрміновым увядзеньні пакту ў сілу. Няцяжка бачыць, што Стымсон, інспіруючы антысавецкую акцыю і, зразумела, ігнаруючы інтарэсы тых краін, якім ён навязвае волю амэрыканскага капіталу, ня толькі выкрывае канчаткова сваё непрыязнае антысавецкае выступленьне, але і кампрамэтуе сур'ёзнейшым чынам улю бёнае дзіця амэрыканскай дыплёматыі —пакт Кэлёга.

Пры створанай у сучасны момант сытуацыі, калі бессэнсоўнасьць самога ўмяшальніцтва ў канфлікт зусім яснае, калі ў адказе саюзнага ўраду дзяржавам іх дэмарш афіцыйна ахарактарызаваны, як нярэгулярны акт, калі відавочна, што ўдзел у акцыі асобных краін зьяўляецца толькі антысавецкаю дэманстрацыяй па ўказцы Стымсона,—далучэньне да выступленьня Злучаных Штатаў, у сучасны момант трэба лічыць шагам, яшчэ больш варожым у адносінах да СССР, чым выступленьні саміх дзяржаў-ініцыятараў ўмяшальнасьці.

(«ИЗВЕСТИЯ»).

Супроць белага тэрору ў Японіі

Адозва Зах.-Эўрапэйскага бюро Камінтэрну

БЭРЛІН, 22. Заходня-Эўрапэйскае бюро Камінтэрну і эўрапэйскі сакратарыят Прафінтэрну апублікавалі адозву да рабочых усяго сьвету і прыгнечаных мас калёній і працоўных Савецкага Саюзу.

Адозва пратэстуе супроць тэрору ў Японіі, супроць расправы над перадавымі пралетарамі. «У апошнія месяцы, —гаворыцца ў адозьве — у турмы было кінута 800 пралетарскіх барацьбітоў. У Японіі прыняты закон аб пакараньні сьмерцю, накіраваны супроць камуністых. Японскі міністар унутраных спраў заявіў, што палітзьняволеныя будуць пакараны бяз суду. Сотні пралетараў знаходзяцца пад пагрозаю пакараньня сьмерцю. Для падтрыманьня японскага пралетарыяту павінны падняцца рабочыя ўсіх краёў і прыгнечаныя масы ка-

Абмен нотамі паміж ангельскім і савецкім урадамі

ЛЁНДАН, 20. Сёньня ўпоўнаважаны прадстаўнік СССР у Лёндане тав. Сакольнікаў і дарадца поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР т. Багамолаў наведалі ангельскага міністра замежных спраў Гэндэрсона. Тав. Сакольнікаў і Гэндэрсон абмяняліся нотамі ангельскага і савецкага ўрадаў па пытаньні аб узаемным устрыманьні ад варожых выступленьняў. Тэкст ангельскае ноты міністэрствам замежных спраў яшчэ не апублікаваны.

Мэмарандум францускага ўраду па пытаньні морскага разбраеньня

ПАРЫЖ, 22. У мэмарандуме францускага ўраду да ангельскага ўраду па пытаньні аб морскім разбраеньні падкрэсьліваецца, што пытаньне гэта зьяўляецца толькі складанай часткаю праблемы агульнага абмежаваньня ўзбраеньняў, якую павінна вырашыць Ліга Нацыяў. Ліга Нацыяў [illegible] праблему на [illegible] Тым [illegible] абмеркаваўшы гэта пытаньне, пры-

Рэвалюцыйная барацьба ў калёніях

Паўстаньне супроць ангельскага імпэрыялізму ў Судане

ЛЁНДАН, 20. Агенцтва Рэйтэр паведамляе з Хартума (Англа-Эгіпэцкі Судан): «Варожая пазыцыя правадыра племяні Лафофа ў раёне Талодзі (Англа-Эгіпэцкі Судан) прымусіла ангельскія войскі пачаць ваенныя апэрацыі супроць гэтага племяні. 16-га сьнежня атрад Англа-Суданскіх войск захапіў пры дапамозе паліцыі ў палон тубыльнага правадыра. На наступны дзень тубыльцы адкрылі агонь па войсках, пры чым забілі аднаго салдата і паранілі капітана Лоў, які камандаваў атрадам. Прымаюцца неабходныя меры для пакараньня віноўнікаў».

ЛЁНДАН, 20. «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе з Хартума (галоўны горад у Судане) пра ангельска-[illegible] Фракцыі акрпраўленьня саюзу гарба-

Павялічэньне забясьпячэньня асноўных рабочых раёнаў харчовымі прадуктамі

Пастанова СНК СССР

МАСКВА, 21. Улічваючы, што першапачаткова вызначаныя пляны хлебазагатовак перавышаны і што посьпех хлебазагатовак забясьпечыў магчымасьць стварэньня непарушнага хлебнага фонду ў 2 мільёны тон, — Саўнарком Саюзу ССР пастанавіў павялічыць забясьпячэньне асноўных рабочых раёнаў харчовымі прадуктамі на 250 тысяч тон абожжавых адзінак на другое наўгодзьдзе 1929-30 году звыш раней устаноўленага пляну з тым, каб павысіць нормы Масквы і Ленінграду, рабочых раёны і цэнтры Ленінградзкай і Маскоўскай абласьцей, Іванаўскай, Ніжагародзкай і Заходняй абласьцей, а таксама такія буйныя рабочыя раёны і пункты, як

Партыйнае будаўніцтва

З БАЛЬШАВІЦКАЙ УПАРТАСЬЦЮ—ЗА ДЗЕЙСНАСЬЦЬ АСНОЎНАГА ЛЁЗУНГУ ПАРТЫІ

Жорстка ўдарыць па тых, хто супраціўляецца разгортваньню самакрытыкі і заціскае яе

Як нельга змагацца з заціскам самакрытыкі

Цкаваньне рабкора або „нэрвовыя адносіны" да крытыкі

Партыйныя арганізацыі павінны своячасова рэагаваць на ўсялякі заціск самакрытыкі і змагацца з цкаваньнем тых таварышоў, якія выступаюць з правільнай і патрэбнай крытыкай і самакрытыкай недахопаў і памылак. Нерашучае, нясмелае, павольнае рэагаваньне на факты заціску самакрытыкі недапушчальна. З такімі заявамі трэба своячасова змагацца, трэба выкрываць і выпраўляць памылковасьць такой нерашучасьці ў барацьбе з супраціўленьнем самакрытыцы і заціскам яе.

Ілюстрацыяй павольнасьці і нявыразнай лініі ў абароне рабкораў ад наскокаў глупшеляў самакрытыкі можа служыць справа гомельскага рабкора **Крыштафука** (завод **«Рухавік рэвалюцыі»**). Тав. Крыштафук зьяўляецца старэйшым рабкорам **«Полесской Правды»**, членам партыі, які разгортваў самакрытыку на заводзе і быў абвешчаны гэроем працы. Але па меры ўзмацненьня крытыкі недахопаў адміністрацыі, заводскага камітэту і г. д., наўкола тав. Крыштафука пачала стварацца напружаная атмасфэра цкаваньня і недавер'я. На заводзе пачалі распаўсюджвацца розныя недарэчныя чуткі, якія дыскрэдытавалі Крыштафука і даводзілі, быццам ён у мінулым быў бандытам. Дырэктар заводу неўзабаве прыпомніў, што Крыштафук калісьці раскідваў... праклямацыі. Пры больш дасканалай праверцы ўсё гэта аказалася агідным паклёпам. Гэты-ж дырэктар на адкрытым сходзе, пры падтрыманьні старшыні заўкому Страшэўскага, імкнуўся дыскрэдытаваць рабкора. На другім партсходзе дырэктар абвінаваціў яго ў беспадстаўнай дыскрэдытацыі гаспадарнікаў. Гэта нежарніяная абстаноўка цкаваньня і ізаляцыі прымусіла тав. Крыштафука падаць заяву ў АКК-РСІ ящчэ ў лістападзе 1928 году.

АКК-РСІ даручыла сакратару гарадзкога РК КП(б)Б расьсьледаваць справу. Тым часам, у «Полесскую Правду» накіроўваюцца карэспандэнцыі супроць тав. Крыштафука, у якіх фігуруюць паклёпніцкія чуткі. Адначасова разгортваецца кампанія супроць насьцензэты, кідаюцца на яе адрасе абвінавачаньні ў склочніцтве. Злосьць супроць т. Крыштафука асабліва ўзмацнілася са зьмяшчэньнем у «П. П.» заметкі аб тым, як група членаў партыі, на чале з старшынёю заўкому, замест удзелу ў Кастрычніцкіх урачыстасьцях, наладзіла прыватныя вечарынкі. Старшыня заўкому, даведаўшыся, што Крыштафук зьяўляецца рабкорам часопісі «Прафрух», дасылае ў рэдакцыю ліст, у якім высоўвае супроць тав. Крыштафука рад агідных абвінавачаньняў. Рэдакцыя «П. П.» у студзені 1929 г. зварачаецца ў РСІ з рэзкай заявай, у якой патрабуе абароны рабкораў і хуткага пакараньня вінаватых у цкаваньні і заціску. Ня гледзячы на гэта, справа абмяжоўваецца толькі перапіскай з рэдакцыяй час «Прафрух». Учынак старшыні заўкому выкрываецца, але пытаньне аб цкаваньні рэзка і рашуча ня ставіцца.

І-га сакавіка раённы камітэт абмеркаваў вывады па абсьледваньні ячэйкі заводу. Была дана адмоўная характарыстыка рабоце ячэйкі таму, што яна ня справілася, як належыць, з паставленымі перад ёю задачамі. Пытаньне-ж аб цкаваньні рабкора і заціску самакрытыкі не атрымала патрэбнага адлюстраваньня ў вывадах. Была ўхвалена «далікатная» фармулёўка, якая адзначала толькі «нэрвовае рэагаваньне» адміністрацыі на крытыку з боку рабкораў. Ня гледзячы на тое, што спробы дыскрэдытаваць т. Крыштафука мелі месца, РК абмежаваўся толькі асуджэньнем гэтага ўчынку адміністрацыі. У мэтах «збалянсаваньня» ў вывадах было адзначана, што з боку рабкора было дапушчана распаўсюджваньне «няправільных» чутак. У той час, калі на заводзе быў выключны заціск самакрытыкі, дырэктывы аб барацьбе за самакрытыку ня былі пастаўлены рэзка і выразна.

Пытаньне аб старшыні заўкому, які адкрыта заціскаў самакрытыку, перадаецца на разгляд у АКК (тымчасам гэты глупышель самакрытыкі перайшоў на другі завод). Члену заўкому абвяшчаецца вымова, але не за заціск самакрытыкі, а за... склочніцтва і «нервовае рэагаваньне» на крытыку. Дырэктару паказваецца на патрэбнасьць больш чулага рэагаваньня на крытыку. Між тым, высьветлілася, што дырэктар заводу фактычна заціскаў самакрытыку. Гэтай справай займалася камісія АКК-РСІ, але і яна толькі паўтарыла вывады камісіі раённага камітэту партыі. Вывады камісіі АКК заслугоўваюць самае сур'ёзнае ўвагі. У пачатку вываду канстатуецца адсутнасьць заціску самакрытыкі з чыйго-б там ні было боку. І ў гэты-ж час ніжэй камісія паведамляе аб самых сапраўдных грубых парушэньнях самакрытыкі (цкаваньне рабкора, дыскрэдытацыя яго, нерэагаваньне на заметкі з боку ячэйкі і фракцыі заўкому і г. д.).

Зусім відавочна, што такое вырашэньне пытаньня аб заціску самакрытыкі зьяўляецца памылковым і не дало ячэйцы яснай і выразнай установкі ў рашучай барацьбе з парушэньнямі самакрытыкі.

Толькі праз 7 з паловай месяцаў у кастрычніку АКК-РСІ ўзялася за гэту справу, як належыць, даручыўшы новай камісіі дарасьсьледаваць справу тав. Крыштафука.

На гэты раз камісія ўжо прызнала наяўнасьць цкаваньня рабкора і скасавала вывады першай камісіі АКК і раённага камітэту. Так, пасьля доўгіх хістаньняў, нарэшце, АКК узяла правільную і рэзкую лінію ў адносінах да глупышеляў самакрытыкі, сурова пакараўшы групу таварышоў, у тым ліку дырэктара заводу. АКК асудзіла слабасьць у барацьбе з заціскам самакрытыкі, якая (слабасьць) была праяўлена раённым камітэтам і камісіяй РК.

З усіх гэтых фактаў відаць, якая патрэбна пільнаваць у такіх пытаньнях.

А. ВІНАГРАДАЎ.

Дзе самакрытыка была прыдушана

Гарбарня **«Пралетарскі Шлях»** у Гомолі за апошні час была аб'ектам асаблівае ўвагі з боку цэнтральнага друку—газэт **«Известия»** і **«Эмэс»** — у сувязі з тымі прарывамі і недахопамі, якія мелі месца на гарбарні. У прыватнасьці, цэнтральны друк цікавіўся справай рабкора Дубава — рабочага гэтай гарбарні. Зразумела таму, з якім інтарэсам партыйная і рабочая грамадзкасьць чакала праверкі партыйнай ячэйкі гарбарні.

Ці дапамагло праведзенае ў красавіку аздараўленьне заводу і ачышчэньне гарбарні ад тых элемэнтаў, якія праводзілі дэзарганізатарскую падрыўную работу? Ці спрыяла гэта мерапрыемства поўнаму аздараўленьню стану гарбарні і разгортаньню на прадпрыемстве масавай самакрытыкі і крытыкі? Вось тыя важныя пытаньні, на якія павінна даць адказ праверка і чыстка гэтай ячэйкі.

***

Першыя дні чысткі выразна паказалі, што самакрытыка ў ячэйцы была прыдушана. Тых таварышоў, якія выступалі з крытыкай і самакрытыкай, абвінавачалі ў групаўшчыне і імкненьні падарваць работу бюро ячэйкі.

Камуністы **Гелер**, які доўгі час быў сакратаром ячэйкі, згрупаваў паўкола сябе толькі невялічкую групу актыву, з якім і праводзіў усю работу. Партыйцу Шубу ён заявіў: «Калі будзеш падтрымліваць Дубава (гэты рабкор выкрываў недахопы і памылкі), разьвітайся з партбілетам». Тав. Караскіну, які паказаў на памылкі дырэктара, Гелер зазначыў: «Ты проста трапіў пад уплыў Шубы». Наогул, як толькі які-небудзь партыец выступаў з крытыкай недахопаў, яго адразу залічалі ў «групу».

Партыйцы проста заўлялі, што тав. Гелер не зразумеў, як належыць, значэньне самакрытыкі. Напрыклад, на адным партсходзе Гелер у сваім выступленьні сказаў, што крытыку снаёй дзейнасьці ён разглядае ня толькі, як нападкі на яго. Гелера, а і як нападкі на правільную лінію партыі.

Наогул самакрытыка праводзілася на гарбарні і ў ячэйцы толькі «в общем и целом». На канкрэтныя факты не рэагавалі. Ня дзіва, што партыйцы маўчалі, маўчалі і беспартыйныя рабочыя.

Звольнены з гарбарні як актысавецкі элемэнт **Гублер** быў потым зноў прыняты на гарбарню на часовую работу (на «часовае» шкодніцтва, як гаварылі таварышы на праверачным сходзе). Дзе-ж былі партыйцы, рабочыя, чаму яны на заявілі аб намылцы з звольненьнем Гублера, або ў адваротным выпадку, чаму яны не пратэставалі супроць прыёму на гарбарню «шкодніка» на часовую работу?

А справа заключаецца вось у чым. Звальненьне Гублера па пастанове АКК-РСІ было скасавана ЦКК-РСІ. Але пастанова ЦКК ня была даведзена да ведама камуністых і беспартыйных рабочых гарбарні. Партыйцы былі запалоханы пагрозамі, што аб іх будуць ставіць пытаньне на бюро ячэйкі. Шушуканьні і разважаньні па кутох сталі звычайным зьявішчам. Насьценная газэта, з прычыны заціску самакрытыкі, была бязьзубай. Таму рабочыя мала цікавіліся і ня чыталі яе. **Былі выпадкі цкаваньня тых, хто выступаў з крытыкай.**

Шырока ўжывалася ў адносінах да некаторых рабочых сыстэма вымоў з перавадам на горшую, менш аплачваную работу. Рабочага Майнбурга за некаторыя думкі аб недахватах работы перанялі з работы, якая аплачвалася менш на тры разрады. Рабочы Цітэнскі на адным партсходзе заявіў: «Навошта замазваць недахопы, лепш тады зусім не гаварыць». Тав. Гелер, зусім ня ўлічваючы хваравітага стану таварыша, паставіў аб ім пытаньне на бюро ячэйкі. У выніку была ўхвалена надзвычайна цікавая сваім зьместам пастанова: «Бюро ячэйкі адзначае паводзіны Цітэнскага на партсходзе, дзе выявілася яго недавер'е да бюро ячэйкі, а таксама моманты замкнутасьці (?). Гэта зьяўляецца нетактычным для члена партыі, і таму прапанаваць Цітэнскаму зьнішчыць гэта і г. д.».

Затое бессаромная сямейнасьць і змазваньне «няпрыемных» спраў з боку тых, хто бліжа стаяў да кіраўнічай групы партыйцаў не сустракалі асуджэньня.

Ня раз рабочыя паказвалі на недапушчальнасьць прывілей, якімі карыстаецца т. Гелер на вытворчасьці, і на яго асобныя грубыя ўчынкі. Але ўсё гэта не сустракала рэагаваньня з боку бюро ячэйкі.

Асабліва абурэньне выклікала справа з паездкай дырэктара Фінкельштэйна на курорт. Гэта гісторыя падрабязна асьветлена ў заметцы ў «Полесской Правде» пад загалоўкам: **«Дело доходит до вымогательства»**. Фінкельштэйн атрымаў за месяц у страхкасе 150 руб. (водпуск па хваробе) і 180 руб. на прадпрыемстве за дзяржводпуск. Аднак, у сувязі з тым, што заўком гарбарні меў некалькі дармовых месц на курорт, куды заводскі камітэт хацеў накіраваць трох рабочых, у тым ліку і Фінкельштэйна, апошні атрымаў ящчэ **100 руб. з аднаго рабочага за перадачу сваіх праў на курортнае месца.**

Гэтае пытаньне не абмяркоўвалася ні ў саюзе, ні ў заўкоме і было вырашана сямейным парадкам. За гэта гэтым органам абвешчана вымова, а Фінкельштэйну прапанавана вярнуць рабочаму 100 рублёў.

Рэзкая характарыстыка была дана т. Фрэнкелю які правіў нядольнасьць быць старшынёй заўкому, быў нячулым да рабочых, грубя абыходзіўся з апошнімі і г. д. Некаторыя таварышы адзначылі, што Фрэнкель зьяўляецца злосным прагульшчыкам (з 12 прапрацаваных дзён, 5 дзён зусім ня быў на рабоце).

***

Вось, што выявілася ў першыя дні чысткі гарбарні «Пралетарскі Шлях». Задача праверкому заключаецца цяпер у тым, каб стварыць на праверсходах такія ўмовы, якія забясьпечылі-б ящчэ больш шырокае разгортваньне самакрытыкі і выкрышчэ ўсіх тых хваравітых зьяў, што ёсьць у ячэйцы.

ПАРТЫЕЦ.

Нацработа—важнейшая палітычная задача вайсковых партарганізацый

З ўсёй рашучасьцю павінны быць выгнаны з часьцей элемэнты беларускага нацыянал-дэмакратызму, велікарасійскага шавінізму, антысэмітызму і ўсялякіх праяўленьняў нацыянальнай няроўнасьці.

Партарганізацыі часьцей павінны сапраўды стаць на чале беларусізацыі і ўсяе нацыянальнае работы.

За выразную ленінскую лінію ў нацработе

Нацыянальнае будаўніцтва ў Чырвонай арміі зьяўляецца часткай нацыянальнай палітыкі савецкай улады. Пасьпяховае вырашэньне нацыянальнага пытаньня ў арміі ўзмацніе яе магутнасьць і абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

Вайсковыя часьці, разьмешчаныя на тэрыторыі БССР, разам з усёй Чырвонай арміяй, **дасягнулі вялікіх посьпехаў у галіне нацыянальнай работы** як па лініі беларусізацыі, так і па лініі работы з чырвонаармейцамі нацыянальных меншасьцяй. Дасягненьні гэтыя выказваюцца ў агульным няўхільным узмацненьні беларускіх нацыянальных фармаваньняў, у пашырэньні матар'яльнай базы нацработы, росьце камандных кадраў з карэннага насельніцтва, нарэшце, у паляпшэньні ўсёй пастаноўкі работы па інтэрнацыянальна-клясавым выхаваньні складу часьцей.

Але побач з гэтымі дасягненьнямі **маюць яшчэ месца буйныя недахопы.** Карэспандэнцыі з раду часьцей, якія сёньня друкуюцца, гавораць аб тым, **што ў некаторых вайсковых падразьдзяленьнях пытаньні нацработы яшчэ не знайшлі належнай увагі з боку партарганізацый,** што выклікае асобныя выпадкі супраціўленьня беларусізацыі, праяўленьня антысэмітызму і г. д. Ёсьць асобныя выпадкі і недацэнкі барацьбы з праявамі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму. А гэта барацьба набывае асабліва важнае значэньне ва ўмовах вайсковай партарганізацыі.

Бясспрэчна, што ў партарганізацыях асобных часьцей мае месца некаторы адрыў ад жыцьця КП(б)Б, некаторае адставаньне ў пытаньнях барацьбы за чыстату партыйнай лініі ў нацыянальным пытаньні. Вялізарная работа, якая праведзена КП(б)Б за апошні час па выкрыцьці карэньняў і сутнасьці нацыянал-дэмакратызму (як беларускага, так і яўрэйскага і інш.), барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам і шавінізмамі ўсіх колераў, не знайшлі своячасовага і даволі поўнага адлюстраваньня ў рабоце вайсковых партарганізацый. Слаба адлюстроўваюцца ў практычнай рабоце пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б, які даў установку на радзе кардынальных пытаньняў работы КП(б)Б. Багатая практыка, накопленая БССР у галіне нацыянальнага будаўніцтва, не пераносіцца ў належнай ступені ў часьці, што знаходзяцца ў Беларусі, у тым ліку і нацыянальныя. Невыстарчальная і сувязь часьцей з беларускімі культурнымі ўстановамі.

Адзначаючы ўсе гэтыя недахопы, нельга не адзначыць, што **тут адзін з нямалаважных прычын зьяўляецца часамі слабая ўвага і ўдзел у нацработе часьцей БВА мясцовых грамадзянскіх партарганізацый і партыйных камітэтаў.** Між тым, штодзённая сувязь і дапамога з боку апошніх зьяўляецца неадрыўнай умовай посьпеху нацработы ў часьцях.

Да гэтага часу амаль не зварачалася ніякай увагі на гэтае пытаньне і нашым друкам.

Трэба дабіцца пералому ў бок большай увагі грамадзянскіх парторганаў нацработе ў часьцях. Трэба забясьпечыць і ўсямерна дапамагчы вайсковым часьцям ажыцьцёвіць усіх тых практычныя мерапрыемствы, якія намеціла акруговая нарада па нацработе, што адбылася сёлета пры Палітуправе БВА.

На барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам

Беларускія нацыянальныя часьці маюць ужо значныя дасягненьні ў справе нацработы. Партыйная нарада аб нацыянальнай рабоце ў вайсковых часьцях БВА, якая адбылася ў красавіку г. г., дала значны штурпок гэтай справе, яшчэ раз падкрасьліўшы партыйныя ўстаноўкі і вызначыўшы практычныя мерапрыемствы па беларусізацыі.

Для далейшага пасьпяховага праведзеньня беларусізацыі як у вайсковай партарганізацыі, так і ва ўсёй КП(б)Б, патрэбна поўная мабілізаванасьць кожнай ячэйкі на рашучую перамогу нацыянал-дэмакратызму — гэтай галоўнейшай небясьпекі ў сучасны пэрыяд. Іменна цяпер больш за ўсё выпірае той пункт пастановы нацнарады, які адзначае, што «найважнейшая задача партарганізацыі часьцей зьяўляецца барацьба за ленінскае разуменьне пытаньняў нацыянальнай палітыкі, рашучае выяўленьне ўсякіх ухілаў ад правільнай лініі партыі ў гэтай галіне, асабліва права ўхілу, які выявіўся ў дыскусіі на «тэатральных пытаньнях».

Вось гэтую мабілізаванасьць партарганізацыі часьцей на барацьбу з праявамі нацыянал-дэмакратызму нельга прызнаць здавальняючай. Толькі некаторыя адзінкавыя партарганізацыі гэрагавалі на апошнія выпазкі нацыянал-дэмакратызму, а ўся маса ящчэ не прыняла належнага ўдзелу. Нельга не адзначыць, што беларуская вайсковая газэта «Чырвонаармейская Праўда» своячасова не паставіла з усёй паўнатой і вострасьцю гэтага пытаньня. Амаль зусім не займалася ім расійская газэта Беларускай вайсковай акругі.

Калі мы да гэтага часу ня мелі нацыянал-дэмакратычных выступленьняў у чырвонаармейскіх часьцях (а можа часамі іх не заўважвалі), дык ад гэтага Чырвоная армія зусім не забясьпечана. Клясавая барацьба ў беларускай вёсцы і горадзе знаходзіць сваё поўнае праламленьне і ў арміі, і ў жыцьці кожнай часьці. Толькі выступленьні кулака, праявы нацыянал-дэмакратызму ва ўмовах арміі адбываюцца не непасрэдна, а больш замаскавана вуальлю савецкай лёяльнасьці, чым па-за межамі Чырвонай арміі. Тым больш патрэбна падрыхтаванасьць партарганізацыі, каб кожная партарганізацыя здолела распазнаць самыя тонкія вылазкі клясавага ворага.

Далейшае пасьпяховае праведзеньне беларусізацыі немагчыма без барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, як немагчыма перамагчы нацыянал-дэмакратызм без актыўнага праведзеньня беларусізацыі.

Відомая рэч, што барацьба з нацыянал-дэмакратызмам ня зьнімае барацьбы з вялікадзяржаўным (як і іншым) шавінізмам.

Ва ўмовах вайсковых партарганізацый задача барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам таксама застаецца на чарзе дня.

Гаворачы пра нацработу ў беларускіх часьцях, трэба адзначыць, што яна пачала ўваходзіць у той этап, калі вельмі востра адчуваецца патрэбнасьць падвесьці пад яе больш моцную матар'яльную базу ў выглядзе забясьпячэньня ўсёй вайскова-палітычнай вучобы чырвонаармейца-беларуса літаратурай, дапаможнымі прыладамі, матар'яламі навочнай агітацыі і г. д. Тая-ж самая парада па нацпытаньні прыняла рад пастаноў, накіраваных на тое, каб задаволіць гэту патрэбу. Так, ухвалена пастанова аб выданьні статутаў, вайсковай навучальнай літаратуры, вайсковай літаратуры, зазначаны такі канкрэтныя рэчы, як выданьне зборніка сьпеваў чырвонаармейскай эстрады і інш. Нельга сказаць, што прыняты пастановы ў гэтай галіне ня выконваліся, але тэмп іх выкананьня прымушае жадаць лепшага. Тыя сродкі і сілы, што кінуты на гэту справу, трэба прызнаць зусім неадпавядаючымі сапраўднай патрэбнасьці. Адпаведныя ўстановы — палітуправа, нацкамісія ЦВК — павінны ўзьняць зноў і вырашыць пытаньні забясьпячэньня беларусізацыі нацчасьцей.

А. САМАХВАЛАЎ.

З беларусізацыяй слаба

У 2-м артыперыйскім палку сярод нач складу беларуская мова ўжываецца вельмі нязначна. Калі праводзіўся сэмінары для групаводаў палітзаняткаў у палку, дык паліткіраўнікі, якія былі выкладчыкамі, гаварылі выключна на расійскай мове, ня гледзячы на тое, што самі слухачы патрабавалі выкладаць па-беларуску.

У штабе палка таксама не распачалася ящчэ сапраўдная беларусізацыя, акрамя загадаў па палку, якія з горам папалам друкуюцца на беларускай мове.

Усе плякаты і лёзунгі па ленкутках, клюбе, казармах напісаны зусім няпісьменна пабеларуску, маюць па некалькі памылак у адным слове.

Трэба адзначыць, што малодшы начсклад і чырвонаармейцы далёка выпераздзілі ўвесь іншы начсклад у галіне беларусізацыі.

Наогул, у галіне нацыянальнай працы ў палку трэба адзначыць вялікія недахопы. Апошнія вылазкі нацыянал-дэмакратаў на Беларусі нас засталі зьнянацку і зьявіліся зусім неспадзяванымі і незразумелым выпадкам. Сутнасьць і карэньні нацыянал-дэмакратыі намі добра не ўсьвядомлены. Пастаўлены быў толькі адзін даклад на палкавым партсходзе і больш нічога.

Пытаньні лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б мы толькі што пачынаем прапрацоўваць і належнай работы тут ящчэ не праводзілася.

ПЯЦЮШКІН.

Беларускіх кніг мала

Калі зойдзеш у палкавую бібліятэку 2-га артыпалерыйскага палка, то рэдка калі знойдзеш кнігу на беларускай мове. 80 проц. усіх кніг — расійскія. Амаль што ўсе падручнікі таксама расійскія. Слаба і з беларусізацыяй, а таксама і ў галіне партыйна-камсамольскай асьветы. Тут заняткі вядуцца ў большасьці на расійскай мове.

Такое становішча для нацыянальнай часьці ненармальна.

С. СЯРДЗЮКОЎ.

Чакаюць першага студзеня

Пытаньні беларусізацыі ў 33 артпалку ўжо абгаворваліся два разы, але-ж агульны тэмп беларусізацыі невыстарчальны. Партыйныя ячэйкі штодзённа слаба кіруюць гэтай справай. Камуністы і камсамольцы ящчэ вельмі мала гавораць у жыцьці на беларускай мове. Выпіска беларускіх газэт і часопісяў зусім малакольксная. Усяго выпісваецца клюбам 3 экз. «Зьвязды» і 5 экз. «Беларускай Вёскі». Перасьланьня ў палку беларускіх газэт і часопісяў ня выпісвае ні адзін чалавек. Беларускія кніжкі чытаюцца таксама слаба, толькі каля 25% усяго складу чытаючых. Гэта сьведчыць аб слабой зацікаўленасьці вывучэньнем беларускае мовы ў палку. Сярод некаторай часткі, нават камуністых, ёсьць так званы «ціхі сап». Напрыклад, клюб палка павінен поўнасьцю перавесьці агітацыю на белмову, але-ж лёзунгі і абвесткі малюцца на расійскай мове. Ёсьць выпадкі насьмешак з беларускіх слоў, як з слова куляход, стрэльба і г. д. З боку-ж партячэек да гэтага адносіны прымірэнчыя. Жанчыны вайсковыя служачыя зусім не карыстаюцца беларускай мовай ні ў сям'і, ні ў грамадзкіх мясцох. І сярод апошніх у належнай ступені праяўляецца вялікарускі шавінізм. Некаторыя кажуць, што беларуская мова гэта «пякультурная мова», нярпгожая і г. д. Трэба адзначыць, што **партарганізацыя палка з гэтым ящчэ не вядзе рашучай барацьбы.** Існуючы гурток па вывучэньні беларускай мовай займаецца дрэнна, паведваюць яго таксама слаба. Можна сьмела сказаць, што заданьне падзіву ад нераходзе поўнасьцю з 1-га студзеня на беларускую мову ў палкавой школе ня будзе выканана, бо толькі 20 проц. малодшых камандзіраў райкому карыстаюцца беларускай мовай.

Агульны аб'ектыўны недахоп — гэта тое, што няма ўсіх статутаў на беларускай мове. Трэба як найхутчэй іх пераладжыць.

Партарганізацыі палка і падзіву трэба больш рашуча і практычна паставіць пытаньне беларусізацыі.

Я. ТАМАШЭВІЧ.

Пераломам зроблены

40 кавалерыйскім палку за нацыянальную работу зараз узяліся, як належыць. На пашыраным пасяджэньні партбюро, на партыйным і камсамольскім сходах грунтоўна абгаварылі і завастрылі ўвагу ўсёй партыйнай і камсамольскай арганізацыі на праведзеньне ў жыцьцё пастаноў акруговай нарады па нацыянальнай рабоце.

Калі ў мінулым годзе ў нас былі толькі спробы працаваць на роднай мове, то зараз мы намецілі ў гэтых адносінах цэлы рад канкрэтных мерапрыемстваў. Асноўны кантынгент папаўненьня палка—украінцы, і таму ў парадку работы сярод нацменшасьцяй зьвернута асаблівая ўвага на украінізацыю. Так, палітзаняткі ў некаторых групах будуць праводзіцца на роднай мове. Праведзена парада нацыяналаў-ваенкораў і пазашкольнікаў. Закуплена і выпісана ящчэ літаратура і газэты адпаведна нацыянальнасьцям, што ёсьць у палку. Ужо часткова адлюстроўваецца нацработа ў ленкутках і лёзунгах, вітрынах і асабліва ў насьценгазэтах, у якіх адводзяцца цэлыя аддзелы. Бясспрэчна, у гэтым годзе мы будзем мець па лініі нацработы значныя зрухі і належныя вынікі.

І. Алейчык.

Добра, ды ня зусім

6-ты страпковы полк уваходзіць у склад нацыянальнай дывізіі і таму ўся праца: заняткі з чырвонаармейцамі, сходы, гурткі і каманды палаюцца па беларускай мове. Чырвонаармейцы гавораць пабеларуску. Гэта вельмі добра.

Але разам з гэтым у галіне беларусізацыі ў палку ёсьць рад недахопаў. Калі афіцыйна сходы і заняткі на 100 проц. праводзяцца на беларускай мове, дык у штодзённых гутарках начсклад і чырвонаармейцы на роднай мове мала гавораць. Адгэтуль яна зьяўляецца як-бы мовай «афіцыйнай».

На агульным сходзе камскладу камісар палка тав. Патунаў, пачаўшы даклад сказаў: «Для пользы дела, товарищи, я буду говорить на русском языке».

Цікава, для якой гэта «пользы дела» трэба гаварыць парасійску ў беларускім палку, дзе амаль 100 проц. вайсковых служачых—беларусы?

У палку толькі 5 асоб з начскладу выпісвае і чытае беларускія газэты. У бібліятэцы палка начсклад бярэ ў большай частцы расійскія кніжкі. Дыкяк-жа начсклад праводзіў і будзе праводзіць беларусізацыю, калі сам мала зварачае ўвагу на беларусізацыю?

А. Сухарукаў.

Паглыбіць інтэрнацыянальнае выхаваньне байца

Ва ўсёй рабоце па выхаваньні з чырвонаармейца сьвядомага байца-рэвалюцыянэра вялізнае месца павінны заняць пытаньні інтэрнацыянальнага выхаваньня, бязьлітаснай барацьбы з усякімі праяўленьнямі нацыянальнай варожасьці. Гэта работа набывае асабліва важнае значэньне ў сучасны момант, калі наша Чырвоная армія папоўнілася новымі маладымі сіламі. Ва ўмовах нашай Самарскай кавдывізіі, куды прыбыла даволі вялікая колькасьць чырвонаармейцаў з розных рэспублік (УССР, Татрэспубліка), трэба работу гэтую вынуліць, як адну з сур'ёзьнейшых задач.

Некалькі фактаў з жыцьця з усёй відавочнасьцю даводзяць гэтае палажэньне.

Аднаго чырвонаармейца-украінца перавялі ў другі полк. І гэты таварыш зазначае, што яму пажадана было-б застацца ў палку, бо там многа «кацапаў».

Ёсьць факты антысэмітызму, якія выяўляюцца ў тым, што яўрэя называюць «жыдам».

Ёсьць ящчэ больш цікавы факт. Чырвонаармеец пашоў у амбуляторыю ўстаўляць зубы. Калі яму сказалі, што золата няма, а можна ўставіць аўбы толькі касьцяныя, ён сказаў. «Я ведаю, чаму золата няма—усё золата жыды забралі».

Гэтыя факты масавага характару ня носяць, ёсьць выключныя выпадкі. Аднак, наяўнасьць і гэтых фактаў прымушае нас з усёй сур'ёзнасьцю ўзяцца за работу па выкрыцьці кулацка-нэпманскай антысэміцкай агітацыі, за работу па ліквідацыі нацыянальнай варожасьці, вырваць з карэньнем праяўленьне ўсякіх шавінізмаў.

Шыфрын.

Сталін і нацыянальная палітыка Ленінскай партыі

Леніну і тав. Сталіну належыць заслуга своячасовай і выразнай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня перад нашай партыяй у гады перад сусьветнай імпэрыялістычнай вайной, пралетарскай рэвалюцыяй у Расіі і разгортваньнем нацыянальна-калёніяльнага руху на вялізных тэрыторыях земнае кулі, што знаходзіліся ў руках імпэрыялістычных дзяржаў.

Рэвалюцыя 1917 г. (а ящчэ раней за яе імпэрыялістычная вайна сапраўды зрабіла нацыянальнае пытаньне надзвычайна актуальным для нашай партыі, і тав Сталін выступіў дакладчыкам па гэтым пытаньні на красавіцкай партыйнай канфэрэнцыі. Многія таварышы на гэтай-жа канфэрэнцыі выказваліся супроць права нацый на самавызначэньне, аж да аддучэньня. На гэтай пазыцыі стаялі тады і Бухарын. Яна матывавалася надзвычайна «рэвалюцыйным» аргумантам, што нацыянальны рух ва ўмовах імпэрыялізму, накіраваны да разьдзелу буйных дзяржаў, рэакцыйны; на справе-ж азначала простае падтрыманьне цэнтралісцкай палітыкі буржуазіі і ўбівала клін паміж расійскім пралетарыятам і працоўнымі прыгнечанымі нацыянальнасьцямі.

Большасьць канфэрэнцыі стала на пункт погляду Леніна і тав. Сталіна. Прынятая канфэрэнцыяй рэзалюцыя расьпадала з рэзалюцыяй партыйнае нарады 1913 году. Яна ў вялізнай ступені спрыяла падняцьцю аўтарытэту бальшавіцкай партыі, як адзінага пасьлядоўнага барацьбіта супроць усякага нацыянальнага прыгнечаньня, сярод працоўных мас прыгнечаных нацыянальнасьцяй у адносінах да якіх часовы ўрад цяй у адносінах да якіх часовы ўрад

І калі пачалася Кастрычніцкая рэвалюцыя, яна спаткала падтрыманьне, побач з расійскімі рабочымі, салдатамі і сялянамі, таксама і працоўных мас іншых нацыянальнасьцяй. Праўда, спачатку на Украіне, у Туркестане, Татарыі і г. д. буржуазныя і меншавіцкія нацыяналісты карысталіся поўным уплывам сярод мас. Але гэты ўплыў вельмі хутка пачаў падаць; калі наша партыя разам з лёзунгамі міру, зямлі, рабочага кантролю над вытворчасьцю высунула перад працоўнымі масамі праграму поўнага здавальненьня іх нацыянальных патрабаваньняў і канкрэтнага вырашэньня пытаньня аб самавызначэньні ў форме стварэньня нацыянальных рэспублік з самымі шырокімі правамі, але аб'яднаных ваенным і эканамічным саюзам. Адным з першых законадаўчых актаў савецкага ўраду была выданая **пры бліжэйшым удзеле тав. Сталіна** дэкларацыя праў народаў Расіі, у якой агалашаліся:

1. Роўнасьць і сувэрэннасьць народаў Расіі.
2. Права на свабоднае самавызначэньне аж да аддучэньня і стварэньня самастойнае дзяржавы.
3. Скасаваньне ўсіх і ўсялякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілей і абмежаваньняў.
4. Свабоднае разьвіцьцё нацыянальных меншасьцяй і этнаграфічных груп, што насяляюць тэрыторыю Расіі.

Другім важнейшым праграмным дакумантам савецкае ўлады было выданьне ў сьнежні 1917 году за подпісамі т.т. Леніна і Сталіна адозвы да працоўных мусульманаў Расіі і Усходу. Многія мільёны мусульманаў Туркестану, Паволжжа, Каўказу, Сібіры і г. д. былі найадсталых і прыгнечаных да рэвалюцыі народаў...

Тав. Сталін пасьля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў якасьці члена ЦК і народнага камісара па справах нацыянальнасьцяй стаў **непасрэдным і штодзённым кіраўніком палітыкі партыі па нацыянальным пытаньні.** Першыя-ж крокі гэтай палітыкі ў мацнейшай ступені спрыялі ліквідацыі контр-рэвалюцыйных нацыяналістычных урадаў на Украіне, у Туркестане і г. д. І толькі ўмяшаньне нямецкага імпэрыялізму, якое дало магчымасьць контр-рэвалюцыі ўзмацніцца на акраінах, прывяло да ўпаду савецкай улады на Украіне, у Фінляндыі, Беларусі, у Прыбалтыцы, прычым на большай частцы украінскай і беларускай тэрыторыі ўрачыстасьць контр-рэвалюцыі аказалася, аднак, вельмі кароткачасовай.

У далейшым разгортваньні грамадзянскай вайны правільная ленінская нацыянальная палітыка партыі, якая непасрэдна праводзілася пад кіраўніцтвам т. Сталіна, спрыяла рашучаму посьпеху савецкай улады ў барацьбе з белагвардзейскай расійскай контр-рэвалюцыяй Дзянікіна і Калчака, што прыносіла народным масам былых прыгнечаных нацыянальнасьцяй адраджэньне горшых форм нацыянальнага ўціску.

На ачышчанай ад белагвардзейцаў тэрыторыі населенай нярускімі нацыянальнасьцямі, стварыліся пад кіраўніцтвам Наркамнацу нацыянальныя рэспублікі і вобласьці. Ва многіх з іх прыходзілася мець справу з надзвычай адсталымі масамі, з крайняй слабасьцю, а часамі і поўнай адсутнасьцю камуністычных сіл. Пры арганізацыі рэспублік і кіраўніцтва іх работай і па партыйнай,

драма ў 7 частках

ўжо аб вялізарнейшым такце, асабліва прымаючы пад увагу псыхалёгію прыгнечаных народаў, якія прынуклі з недавер'ем адносіцца да ўсяго, што выходзіць з цэнтру.

Непарыўна зьвязана з імем т. Сталіна стварэньне СССР (у канцы 1922 г.) і выпрацоўка яго канстытуцыі, выпрацоўка тэй формы міжнацыянальных адносін, якія будуць устанаўляцца ва ўсіх народаў, што вызвалюцца ад уціску капіталізму і імпэрыялізму, і што прадуцледжваць цесны эканамічны і ваенны саюз, пры самым шырокім самакіраўніцтве, пры паўнейшай свабодзе разьвіцьця ўсіх нацыянальных культур, пры сыстэматычным зьнішчэньні ўсіх сьлядоў і рэштак нацыянальнае няроўнасьці і пры сыстэматычнай дапамозе больш моцных эканамічных народаў больш слабым.

**Тав. Сталіным напісаны, або пры яго бліжэйшым удзеле выпрацаваны амаль усе важнейшыя прынцыповыя пастанов

ВЫКРЫЕМ КУЛАЦКУЮ АГІТАЦЫЮ ЗА РАЗБАЗАРВАНЬНЕ ЖЫВЁЛЫ

Кулак мяняе лёзунг: „Ня ідзеце ў калгасы" на лёзунг: „Ідзеце ў калгасы бяз сродкаў вытворчасьці"

АРГАНІЗУЕМ СКУПЛЮ ПРАДУКЦЫЙНАЙ ЖЫВЁЛЫ ДЛЯ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ

У сувязі з разбазарваньнем жывёлы ў Рагачоўска-Жлобінскім раёне, аб чым гэтымі днямі паведамлялася ў «Зьвязьдзе», Калгасцэнтр БССР тэрмінова накіраваў туды свайго члена праўленьня для азнаямленьня са станам на месцы і ўжыцьця адпаведных мер. Акрамя таго, Калгасцэнтр БССР накіраваў 8 сваіх адказных працаўнікоў ва ўсе округі Беларусі для высьвятленьня стану з выконваньнем нармальным продажам жывёлы і праверкі выкананьня калгасамі дырэктыў Калгасцэнтру па ліквідацыі разбазарваньня жывёлы.

***

Менакркалгассаюз даў заданьне куставым арганомам і старшыням куставых аб'яднаньняў, а таксама інструктарам, якія выяжджаюць на месцы, каб яны папулярызавалі пастанову Белкалгассаюзу аб недапушчэньні разбазарваньня жывёлы. Пры выяўленьні такіх выпадкаў прапанавана адмаўляць у прыёме ў калгасы.

Менакркалгассаюз перавёў у Сьмілавіцкі і Капыльскі раёны суцэльныя калектывізацыі 30.000 руб. для скупкі жывёлы. Калгасам іншых раёнаў Менчыны пераведзена для гэтай-жа мэты 45.000 руб.

Адначасова на менскай бойні забрана ад мясазагатоўшчыкаў 150 галоў прадукцыйнай жывёлы, якая перадаецца калгасам.

У сучасны момант на мясцох наглядаецца ўжо некаторы пералом. Некаторыя калгасы па сваёй ініцыятыве вынесьлі пастановы аб выключэньні са свайго складу сялян, якія будуць прадаваць сваю жывёлу.

Калгассаюз даў калгасам рад указаньняў адносна стварэньня насенных фондаў. Пры калгасах Капыльскага, Самахвалавіцкага і Сьмілавіцкага раёну такія фонды ўжо створаны.

***

Цэнтральны малочны жывёлагадоўчы саюз таксама прыняў рад мер для адбору жывёлы і ўкамплектаваньня стад у калгасах і саўгасах з тым, каб ні адна прадукцыйная карова ня была зарэзана на мяса.

На мясцох для гэтай мэты створаны спэцыяльныя раённыя і акрутовыя камісіі. У апошні час, такім чынам, адабрана каля 1000 штук рагатай жывёлы.

У некаторых округах—Менскай, Аршанскай—наглядаецца несвячасовая прыёмка жывёлы калгасамі. Часамі прыёмка цягнецца да 20 дзён. Так, прадстаўнік калгасу імя Бароўскага, Бягомльскага раёну, згодна ўмовы з Менакрмалжывсаюзам, павінен быў атрымаць 24 каровы, але пры афармленьні дакумантаў на гэтыя каровы стаяваўся, і каровы засталіся стаяць доўгі час на пляцоўцы жывёлагадоўчага саюзу. Тое-ж самае выйшла з 28 каровамі, якія былі адабраны для калгасу «1-га мая», Плешчаніцкага раёну.

З другога боку ў некаторых мясцох малочная кааперацыя, а таксама округовыя партыйныя і савецкія арганізацыі не зварачаюць увагі на пытаньне барацьбы з разбазарваньнем жывёлы і ўкамплектаваньня стад сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

***

У Наркамгандлі нашаму супрацоўніку паведамілі, што на месцы разасланы цьвёрдыя дырэктывы аб узмацненьні барацьбы з патайным убоем жывёлы.

Уся жывёла, якая выкідваецца на рынак, ні ў якім разе не павінна трапіць у рукі прыватніка на ўбой, на мяса.

Уся гэта жывёла павінна быць закуплена нашымі загатоўчымі арганізацыямі і перадана ў калгасы і саўгасы.

Нашы загатоўчыя арганізацыі павінны разумець усю важнасьць гэтага пытаньня і падыйсьці да гэтай справы ня толькі, як камэрсанты, але і як зацікаўленыя ўзмацненьнем нашых калгасаў і саўгасаў.

За продаж жывёлы выключаны з калгасу

ЖЛОБІН. (Наш кар.). У сувязі з пераходам некаторых сельсаветаў па суцэльную калектывізацыю кулакі вядуць шалёную, варожую агітацыю, якая не сустракае наложнага адпору. Пад уплывам гэтай агітацыі па раёне назіраюцца выпадкі продажу жывёлы тымі гаспадаркамі, якія ідуць у калгас. Асабліва шмат такіх выпадкаў выяўлена ў Бабоўскім сельсавеце, які цалкам уліваецца ў Рагачоўска-Жлобінскі агра-камбінат. Прадаюць жывёлу і ў Стара-Рудненскім, у Лукаўскім сельсавеце.

За грошы, якія атрымліваюць ад продажу, яны набываюць ложкі, самаВары, польты, а большую частку прапіваюць. Цікавы факт меў месца ў Бабоўскім сельсавеце. На сходзе жанчын сялянкі патрабавалі, каб вёска была хутчэй пераведзена ў калектыў, бо сяляне прададуць усю жывёлу і прап'юць грошы.

У раёне зараз прыняты рад мер барацьбы супроць продажу жывёлы. З калгасу імя Войкава выключана за продаж жывёлы 6 чалавек.

Не даюць адпору кулацкай агітацыі

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Газэта «Камунар Магілеўшчыны» зьмясьціла артыкул «Неадкладная задача», у якім канстатуецца рост продажу жывёлы і с.-г інвэнтару на рынку. Газэта адначае, што ў некаторых раёнах ня была зьвернута ўвага на ўцягненьне сялянскай маемасьці ў калгасныя фонды. Не вялася работа па растлумачэньні бядняцка-серадняцкім колам вёскі недапушчальнасьці продажу сялянскага інвэнтару. Кулацкія элемэнты вядуць агітацыю за распродаж інвэнтару ў сувязі з суцэльнай калектывізацыяй акругі. Кулакі кажуць: «прадавай маемасьць, бо ўсё роўна будзеш у калгасе», на мясцох не даюць адпору агітацыі варожых элемэнтаў. Звышнармальны продаж жывёлы скарыстоўваюць у сваіх інтарэсах спэкулянты, а дзяржаўныя арганізацыі не ахапілі рынку і не скарыстоўваюць крэдытаў, адпушчаных на куплю жывёлы.

60.000 руб. на куплю скаціны не скарыстаны

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). За апошнія два месяцы ў мэтах павялічэньня колькасьці жывёлы ў калгасах у округу завезена каля 400 галоў жывёлы. Трэба адзначыць, што с.-г. банк дагэтуль не скарыстаў на куплю жывёлы 40.000 рублёў, якія асыгнаваны на гэту мэту. Таксама і малочны саюз яшчэ не скарыстаў больш за 20.000 руб.

Няўважлівыя адносіны да хаваньня збожжа

Прадстаўнік Дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі тав. Шырокаў, які абсьледаваў становішча хаваньня збожжа ў радзе округ, падзяліўся з нашым супрацоўнікам сваімі ўражаньнямі.

Горш за ўсё стаіць справа хаваньня збожжа ў нізавых пунктах каапэрацыі. Там склады знаходзяцца ў самым кепскім становішчы. Да гэтага часу нізоўка яшчэ ня мае нізкіх інструкцый аб парадку хаваньня збожжа, адсутнічае супрацьпажарная ахова і г. д. Такое дрэннае становішча захаваньня хлеба прывяло да таго, што ёсьць выпадкі, праўда адзінкавыя, псаваньня збожжа. Так, у Барковічах, Полацкай округі, з прычыны няўважлівых адносін папсавалося да 200 пудоў збожжа. Белкаапсаюз да гэтага часу яшчэ не зрабіў усяго магчымага, каб забясьпечыць нармальнае захоўваньне збожжа на складах сваей нізоўкі.

Да гэтага часу на складах усіх арганізацый яшчэ ня прыступлена да барацьбы са шкоднікамі, якія могуць вельмі шмат папсаваць збожжа. У сувязі з тым, што мука і зярно прывозяцца з прыватных млыноў і сялянскіх гаспадарак, дзе амаль што ніколі не праводзілася дэзынфэкцыя, на складах заводзяцца ўсякія шкоднікі. З округ ужо паведамляюць аб тым, што ў некаторых мясцох хлебу пагражае заражэньне шкоднікам—сьвірным кляшчом. Неабходна зараз-жа гэта збожжа ізаляваць і ў першую чаргу накіроўваць для перамолу. Акрамя таго, наглядаецца на асобных складах вялікая колькасьць шкоднікаў-грызуноў, да барцьбы з якімі таксама яшчэ ня прыступлена. Усе арганізацыі павінны ўявіць сабе тыя вялікія страты, якія могуць зрабіць гэтыя шкоднікі і ўзмацніць барацьбу з імі.

Трэба адначыць, што якасьць мукі, якая паступае ад млынароў па памольным зборы, зьяўляецца таксама далёка нездавальняючай. Рагачоўскі млын выпускае муку разам з пяском.

Зусім дрэнна стаіць справа з захоўваньнем пасеўнага матар'ялу. Да гэтага часу яшчэ ня ўзяты на вучот увесь пасеўны матар'ял, які захоўваецца разам з іншым збожжам. У выніку мы маем выпадкі (трэба зноў падкрэсьліць —адзінкавыя, але якія ўжо аб чымсь-ці сыгналізуюць), калі пасеўны авёс ў некаторых мясцох папсаваўся. Неабходна зараз-жа ўзяць на вучот увесь пасеўны матар'ял, вылучыць яго на паасобныя склады, найбольш прыстасаваныя для хаваньня. Неабходна зараз-жа прыступіць да праверкі ўсяго пасеўнага матар'ялу, яго ўскожасьці і якасьці. Увесь непадыходзячы пасеўны матар'ял павінен быць заменены лепшым. Да гэтай справы павінны быць прыцягнуты усе арганомы, якія да гэтага часу зусім ня цікавіліся гэтым пытаньнем.

Наогул, трэба адначыць, што грамадзкасьць, як висковая, так і прафсаюзная, прымае слабы ўдзел, а ў некаторых мясцох зусім ня прыцягнута да справы лепшага захаваньня хлеба і кантролю над становішчам складаў.

Пабудова дому с.-г. каапэрацыі

У будучым будаўнічым сэзоне ў Менску пачнецца пабудова вялікага дому сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Дом будзе будавацца на рагу Валадарскай і Савецкай вуліц, побач з Белсельсаюзам. У гэтым доме будуць зьмяшчацца праўленьні ўсіх спэцыяльных відаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі: Беларускі малочна-жывёлагадоўчы саюз, Белпаляводсаюз, Белсадгародсаюз, Белкалгассаюз.

Сродкі на пабудову дому адпускаюць усе паказаныя ўстановы. Пабудова дому будзе каштаваць 160 тысяч рублёў.

Да выніку праверкі сацдагавароў

КІРАЎНІЦТВА СПАБОРНІЦТВАМ

ЯШЧЭ НЯ СТАЛА АСНОВАЙ ПРАФРАБОТЫ

Ня гледячы на тое, што рад профорганаў ня справіліся з кіраўніцтвам і арганізацыяй сацспаборніцтва, ня гледзячы на тое, што рад гаспадарнікаў стаялі ў баку ад усёй гэтай працы, пэрыяд сацспаборніцтва характарызуецца значнымі посьпехамі ў справе выкананьня прамфінпляна ў сацдагавароў. Усё гэта тлумачыцца тым вялікім працоўным уздымам, які наглядаецца сярод асноўнай масы рабочых. Так, на гуце «Камінтэрн» сацспаборніцтва праходзіць пры вялікім уздыме сярод рабочых. Супроць прагульшчыкаў, рвачоў, накіравана грамадзкая думка рабочых, у выніку чаго прагулы значна скарацілі́ся. Ня гледячы на тое, што па саюзе будаўнікоў сярод рабочых ёсьць вялікая праслойка сэзоньнікаў і нячленаў саюзу, асноўная маса рабочых актыўна праводзіць сацспаборніцтва, што паскорыла тэмп будаўніцтва. Рабочыя будаўнікі падалі рад каштоўнейшых прапаноў, а гэта палепшыла якасьць і зьнізіла кошт будаўніцтва.

З прадпрыемстваў і саўгасаў рабочыя брыгады паведамляюць аб тым, што ў выніку сацспаборніцтва значна палепшыліся адносіны рабочых і работніц да варштатаў, машын, сырцу і наогул да маемасьці дзяржаўнае прамысловасьці. На сходзе рабочых саўгасаў «Ружампаль» (Менакругі) рабочы кажа: «раней, працуючы на палявой рабоце, кожны з нас глядзеў як-бы забрацца ў халадок ды паспаць, а зараз кожны імкнецца выперадзіць другога і паказаць лепшыя вынікі ў рабоце».

Побач з гэтым, трэба адзначыць, што рабочыя па ўласнай ініцыятыве добрах вотна зьнімалі расцэнкі і павышалі нормы выпрацоўкі. Так, на гарбарні «Бальшавік» добраахвотна зьнялі расцэнкі 202 чалавекі, на заводзе «Камунар»—250 чал., на Хлебазаводзе, на цукерні «Прагрэс» і ў радзе іншых прадпрыемстваў таксама значная частка рабочых добраахвотна зьнімала расцэнкі і павялічвала нормы выпрацоўкі. Многія рабочыя адмовіліся ад аплаты за тэхнічныя прастоі, аплаты за навучальнае броні (кучняў), а ў некаторых прадпрыемствах, дзе адчуваецца недахват кваліфікаваных рабочых, праводзіцца добраахвотнае навучаньне некваліфікаваных рабочых не ў рабочы час. Рабочыя будаўнікі г. Менску, Бабруйску і інш. добраахотна падпісаліся атрымліваць зарплату не ў рабочы час, а гэта дало значную эканомію і зьберагло дэфіцытную рабочую сілу.

Рабочыя праяўляюць ініцыятыву і высоўваюць новыя формы і мэтады сацспаборніцтва. Так, швэйнікі г. Бабруйску арганізавалі праверачную брыгаду з рабочых добраахвотнікаў, якія кожны дзень правяраюць прадукцыю, заўважваюць недахопы і завастраюць на іх увагу рабочых. Будаўнікі гор. Менску вылучаюць дэтэпуўнаважаных па спаборніцтве, якія выяўляюць перашкоды сацспаборніцтву і ліквідуюць іх праз вытворчую камісію. На фабрыцы «Гэрой Працы» (Добруш) ударнікі і лепшыя ўдзельнікі вытворчасьці бяруць шэфства над асобнымі варштатамі і машынамі, якія адстаюць у працэсе работы і [illegible] адставаньня і ліквідуюць іх. У гэту работу ўцягнута бюро ІТС.

Вось чым тлумачацца посьпехі сацспаборніцтва. Рабочая маса сваёй энэргіяй, сваёй работай галасуе за лінію партыі, за выкананьне пяцігодкі за 4 гады.

Праверка сацдагавароў значна дапамагла выяўленьню адсталых настрояў і спроб клясавых ворагаў весьці агітацыю супроць сацспаборніцтва. На радзе прад прыемстваў па ініцыятыве брыгадзіраў ЦСПСБ накіраваны партыйна-прафэсыянальныя камісіі, якія выяўляюць прычыны адсталых настрояў і адмоўных зьявішч. Некаторыя парт'ячэйкі, фабзаўкомы і іншыя арганізацыі слаба растлумачваюць мэты і задачы работы, а гэта выклікае неразуменьне сутнасьці сацспаборніцтва, асабліва сярод больш адсталых рабочых.

У большасьці выпадкаў культмасавая работа адарвана ад сацыялістычнага спаборніцтва і ў лепшым выпадку выяўляецца ў вывешваньні плякатаў і лёзунгаў.

Як адзін з асноўных недахватаў культмасавай работы, трэба адзначыць поўную адсутнасьць работы на растлумачэньні значэньня і задач спаборніцтва новым пластом рабочых, якія на радзе прадпрыемстваў складаюць значную частку рабочых, ня ведаюць значэньня сацспаборніцтва і свайго абавязацельства па сацыялістычных дагаворах.

Ня гледзячы на рад абежнікаў, дырэктыў і пастаноў нарад культпрацаўнікоў пры вышэйшых і сярэдніх зьвяньнях прафарганізацый, культмасавая работа саюзаў ня была падпарадкавана задачам сацспаборніцтва. Асноўная прычына гэтага—неыстарчальнасьць, а ў радзе выпадкаў поўная адсутнасьць жывога інструктаваньня на культрабоце на прадпрыемствах.

Некальнем абстаіць справа з асьвятленьнем задач і ходу спаборніцтва праз фабрычна-заводзкі друк (друкаваныя і насьценгазэты). Асабліва трэба адзначыць станоўчую работу друкаваных газэт на прадпрыемствах, якія ў пераважанай большасьці зварачалі вялікую ўвагу на асьвятленьне ходу спаборніцтва і выяўленьне тых недахватаў, якія перашкаджалі разгортваньню спаборніцтва. У гэтай рабоце як друкаваныя, так і насьценгазэты сутыкаліся з асноўным тормазам сваёй работы—слабым рэагаваньнем на заметкі. Былі, вядома, і такія насьценгазэты, якія зусім мала зварачалі ўвагу на асьвятленьне сацспаборніцтва, але іх была меншасьць.

На падставе ўсяго сказанага можна зрабіць агульную ацэнку прафсаюзнага кіраўніцтва сацспаборніцтвам. Трэба адзначыць, што ў большасьці выпадкаў гэтае кіраўніцтва насіла характар часовай кампанейскай работы. Кіраўніцтва сацспаборніцтвам яшчэ ня стала асновай прафсаюзнай работы, асобныя галіны прафработы (культработа, аховa працы) не падпарадкаваны задачам сацыялістычнага спаборніцтва. Сярэднія і вышэйшыя зьвяньні прафарганізацый зусім слаба ажыцьцяўлялі жывое кіраўніцтва і інструктаваньне нізавых прафячэек. Усё гэта сьведчыць аб тым, [illegible]

Праз акіяны і тры кантынэнты

Да звароту гэрояў-лётнікаў

Тав. Шастакоў і Балотаў

«Краіна Саветаў» лётала ў самых цяжкіх атмасфэрных умовах. Большую частку палёту самалёт прабіваўся праз суцэльную пялёнку туманаў. Прышлося перамагчы вятры і баковыя шторны сілаю да 30 мэтраў у секунду.

Аб вялікіх цяжкасьцях пералёту гаворыць той факт, што вялікая частка пералёту праходзіла над бязьлюдной тайгой, дзікімі Курыльскімі выспамі, скаламі берагоў Каналы і, нарэшце, над лютымі хвалямі Ціхага акіяну.

Зроблены «Краінай Саветаў» пералёт дзеліцца на некалькі асноўных этапаў. Першую частку пералёту—Масква-Хабараўск, г. зн. Эўрапэйска-Азіяцкая частка, каля 7.000 кілёмэтраў, самалёт праляцеў за 45 гадзін 25 мінут.

Другі этап—ад Хабараўску да Сіетлю праз Ахоцкае мора і Ціхі акіян—каля 8.000 кілёмэтраў—зроблены за 55 гадзін. Гэта частка пералёту праароблена упяршыню. Дагэтуль нават пры самых лепшых умовах надвор'я ўсе спробы лётнікаў канчаліся няўдачай.

Трэці і апошні этап пералёту—ад Сіетлю ўздоўж берагоў да Сан-Францыско, а потым не перарэз усяго матэрыка да Нью-Ёрку, каля 5.825 кілёмэтраў—пакрыты за 36 гадзін 37 мінут.

Звыш 20.000 кілёмэтраў, з якіх 8.000 кілёмэтраў над акіянам пакрыты самалётам «Краіна Саветаў» за 141 гадзіну. Гэта—нябывалы рэкорд і буйнейшая перамога савецкай авіяцыі.

Тав. Фуфаеў і Стэрлінаў

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы

Увага торфу, попелу, лубіну і вапне

Неадкладна давесьці пляны іх скарыстаньня да асобнага калгасу, саўгасу і вёскі

Дырэктыва аб скарыстаньні мясцовых рэсурсаў павінна быць выканана на 100 проц.

УВАГА МЯСЦОВЫМ РЭСУРСАМ

З году ў год павялічваецца завоз у БССР мінэральных угнаеньняў. Калі ў 1925 годзе ў Беларусь было завезена 6.000 тон, у 1926 г.—10.000 тон, 1927 г.—12.000 тон, 1928 г.—15.000 тон, дык у 1929 годзе гэта лічба дасягнула ўжо 34.000 тон.

На гэты год мы маем атрымаць 32.000 тон мінэральных угнаеньняў у адну толькі веснавую кампанію. Прыблізна такая-ж колькасьць будзе завезена ўвосень.

Аднак, і вызначанай сёлета колькасьці мінэральных угнаеньняў хопіць толькі для скарыстаньня іх пад культуры ільну ў калгасах і саўгасах. Для патрэб кантрактацыі і мэліярацыйных таварыстваў вызначаецца зусім мізэрная колькасьць мінэральных угнаеньняў.

Такім чынам, ставіць пытаньне аб павышэньні ўраджайнасьці ў залежнасьць толькі ад завозу мінэральных угнаеньняў, зразумела, ня прыходзіцца. Зусім відавочна, што трэба зьвярнуць максымальную ўвагу на магчымасьць скарыстаньня мясцовых рэсурсаў. А такімі рэсурсамі БССР даўлі багатая.

ЗАГАТОВІЦЬ 40.000 ГЭКТ.

Асабліва вялікія магчымасьці ёсьць у БССР у галіне скарыстаньня торфу. Вялізарныя тарфяныя паклады на балотах, якіх у БССР налічваецца звыш 2 мільёнаў гэкт., могуць даць такую колькасьць угнаеньняў, скарыстаньне толькі 10-15 проц. якіх дазволіць цалкам затарфаваць усю плошчу рэспублікі.

Да 1929 году на торф, як на ўгнаеньне, у нас не зварачалася ніякай увагі. Толькі летась было прыступлена да скарыстаньня торфу ў плянавым парадку. Дырэктывай ураду прадугледжвалася затарфаваць плошчу ў 5.000 гэкт. На жаль, нават гэткае пяначнае заданьне ня было поўнасьцю выканана.

Сёлета па пляне павінна быць затарфавана 40.000 гэкт. Калі прыняць пад увагу, што ў мінулым годзе ня было выканана такое маленькае заданьне, як 5.000 гэкт., дык стане зразумелым, наколькі вялікай і цяжкой задачай зьяўляецца выкананьне заданьня аб затарфаваньні 40.000 гэкт.

Як забясьпечыць ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства?

Трэба плян тарфаваньня давесьці да асобнай вёскі, калгасаў і саўгасаў. Трэба, акрамя таго, дакладна выявіць і падлічыць усе запасы торфу, які быў загатоўлены летась, і якую колькасьць торфу трэба загатовіць раньняй вясной з тым, каб пад восень скарыстаць яго пад засеў.

На жаль, пакуль што яшчэ мала робіцца канкрэтнага ў гэтым напрамку. Справа ўсё яшчэ абмяжоўваецца плянамі ў акруговым маштабе. Да асобнай вёскі, да асобнага калгасу ці саўгасу плян тарфаваньня яшчэ не дайшоў. Няма таксама хаця-б прыблізных вестак аб колькасьці торфу, які быў загатоўлены ў мінулую восень. З гэтай прычыны невядома, што трэба рабіць у сэнсе здабываньня торфу ў раньнюю вясну. Між тым, часу засталося мала, а падрыхтоўчая работа далёка нялёгкая.

ДАЛЕЙ ЧАКАЦЬ НЕМАГЧЫМА

Значнай увагі заслугоўвае і попел, які з посьпехам можа замяніць калійнае ўгнаеньне. Калійных угнаеньняў завозіцца ў БССР наогул вельмі мала, і таму справа зьбіраньня попелу набывае ў нашых умовах вялізарнае значэньне. Даволі сказаць, што пры добрай арганізацыі мы змаглі-б сабраць такую колькасьць попелу, якая-б замяніла- ў 2 разы большую колькасьць калійных угнаеньняў, што завозіцца ў нашу рэспубліку. Практыка мінулага году паказала, што пры дапамозе шырокай грамадзкасьці і ў прыватнасьці друку, можна вельмі шмат зрабіць у галіне арганізацыі збору попелу. Толькі дзякуючы шырокаму ўдзелу грамадзкасьці, нам удалося летась сабраць каля 20.000 тон попелу. Вельмі дзіўна чаму сёлета грамадзкасьць нават яшчэ не пачала рыхтавацца да арганізацыі збору попелу. Між тым, мы маем заданьне да веснавой кампаніі сабраць 33.000 тон попелу. Выканаць гэта можна толькі пры ўмове неадкладнага разгортваньня кампаніі за збор попелу. У прыватнасьці, у гарадох нічога ня робіцца ў гэтым напрамку ў той час, як яны павінны даць больш паловы вызначанай колькасьці попелу. Калі на прадпрыемствах нешта і робіцца, дык домакіраўніцтвы ня ўжываюць ніякіх мер ні да збору і ні да захаваньня попелу. Заўважаецца, што калгасы і саўгасы, прымацаваныя да адпаведных прадпрыемстваў, не прыяжджаюць за попелам і апошні псуецца.

Трэба неадкладна мабілізаваць грамадзкую ўвагу вакол гэтага пытаньня і дабіцца пэўнага зруху. Далей чакаць нельга.

ЗАГАТОВІЦЬ 8.000 ТОН ЛУБІНУ

Асаблівае значэньне ва ўмовах БССР мае зялёнае ўгнаеньне—лубін. І ў гэтых адносінах мы ўсё яшчэ вельмі мала і мала робім. Летась, напрыклад, было заданьне пасеяць лубін на плошчы 10.000 гэкт. Выканана-ж яно было толькі на 75 проц. Адной з галоўных прычын невыкананьня заданьня—была адсутнасьць належнай колькасьці насеньня. Сёлета па пляне мяркуецца пасеяць лубіну на плошчы 103.000 гэкт., галоўным чынам, насеннаводнага (45 тысяч гэкт. супроць 15.000 гэкт. у мінулым годзе). Выкананьне заданьня залежыць зноў, галоўным чынам, ад насеннай праблемы. Трэба своячасова загатовіць 8.000 тон. Спадзяваецца завезьці насеньне лубіну з іншых раёнаў СССР нельга. Фактычна БССР зьяўляецца раёнам па культываваньні лубіну, і яна павінна была-б яшчэ вывозіць лубін у іншыя месцы.

З-за няўважлівых адносін да лубінавай праблемы, мы ня толькі ня вывозім насеньня лубіну, але ня маем належнай колькасьці яго для ўласных патрэб. Канкрэтна гаворачы, сёлетняе заданьне можна будзе выканаць толькі пры ўмове, калі калгасы, саўгасы і індывідуальныя гаспадаркі да вясны, як належыць, захаваюць насеньне лубіну і ўсё яно будзе ўцягнута ў насенныя фонды. Не сакрэт, што ў мінулыя гады мы заставаліся без насеньня, галоўным чынам таму, што яно трапіла сваю ўскожасьць. Сёлета былі больш спрыяючыя ўмовы з надвор'ем. Лубін у большасьці раёнаў зусім пасьпеў, і яго можна ўжо зараз абмалаціць і здаваць загатоўшчыкам. Як відома, зараз ужываюцца захады да вырашэньня насеннаводнай праблемы лубіну. Праектуецца арганізацыя спэцыяльных лубінавых саўгасаў на плошчы 6.000 гэкт. Гэтага, аднак, мала. Трэба стварыць і спэцыяльныя лубінавыя калгасы.

АБ ВАПНЕ

Нарэшце, аб вапне. Летась шмат крычалі і пісалі аб вапнаваньні. Урадам было запрапанавана абвапнаваць пад азімыя 5.000 гэкт. і пад сёлетнія яравыя —20.000 гэкт. Гэта заданьне было выканана толькі на 31 проц. Фактычна дырэктыва аб вапнаваньні была сарвана. Прычыны—рад арганізацыйных нязвязак, позная дастаўка вапнадрабілак, няўважлівыя адносіны да арганізацыі справы з боку крэдытных таварыстваў, дарагія чыгуначныя тарыфы і г. д. Нельга абыйсьці міма няўдбайнасьці земорганаў, якія ня лічылі патрэбным растлумачыць шырокім масам сялянства карысьць ад вапнаваньня. Былі такія выпадкі, калі ад вапнаваньня адмаўляліся саўгасы і калгасы і нават цэлая акруга ў асобе гомельскага загадчыка акрэа Гэты загадчык, наперакор дырэктыве, заявіў, што вапна толькі шкодзіць глебе. Наглядаліся такія выпадкі, калі вапна дяжала на складах каапэрацыі і ніхто яе не хацеў браць.

Сёлета па пляне мяркуецца абвапнаваць увесну пад яравыя і азімыя 40.000 гэкт. І ўвосень пад яравыя 1931 г.—35.000 гэкт.

Каб унікнуць леташняга зрыву, трэба прыняць рашучыя меры, аб якіх пакуль што ня чуваць. Гэтыя меры павінны быць накіраваны ў бок выпраўленьня дапушчаных летась хібаў, памылак і ліквідацыі тэй няўдбайнасьці да справы вапнаваньня, якая яшчэ ня зьнішчана і зараз.

ВЭН

Ці трэба рэарганізаваць шэфтаварыствы

Ў РАБОЧЫЯ ТАВАРЫСТВЫ ДАПАМОГІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Адказ на артыкул тав. В.

За апошні час у сувязі з абгаварэньнем пытаньня аб арганізацыі рабочага г-ва дапамогі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, на старонках друку ўсё сьмялей і сьмялей чуюцца галасы за ліквідацыю шэфскіх т-ваў. Якія-ж довады прыводзяць «ліквідатары»?

А вось паслухайце разважальні прафпрацаўніка тав. В. на старонках «Зьвязды» ад 10 сьнежня. В. піша, што «Сучаснае становішча шэфства над вёскай не адпавядае поўнасьцю задачам рэконструкцыі і калектывізацыі гаспадаркі».

І далей, тав. В., як быццам шукаючы прычын гэтага зьяўішча, заяўляе. «У шэфскай рабоце вельмі слаба разгорнута масавасьць. Прафарганізацыі дагэтуль амаль зусім ня цікавіцца шэфскай работай. Акрамя таго, самая сыстэма шэфскай работы не дае магчымасьці арганізаваным парадкам уцягнуць усю рабочую масу ў гэту работу».

Што-ж прапануе тав В.? Яго прапановы досыць кароткія, але яны маюць «не вялікі» недахоп—яны «трошкі» разыходзяцца з пастановамі XVI партканфэрэнцыі па тым пытаньні.

«Трэба шэфтаварыствы,—прапануе тав. В.,—рэарганізаваць у рабочыя т-вы дапамогі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, якія павінны быць арганізаваны ў раённым, акруговым і ўсебеларускім маштабе. Членамі рабочых т-ваў дапамогі зьяўляюцца ўсе члены прафсаюзаў, прафсаюзы, калгасы і ўся сыстэма каапэрацыі (у нарадку пайшчыкаў), кожны ўносіць паявы ўнос». І далей. «У гарадох т-вы павінны арганізоўвацца ў гарадзкім маштабе на лініі вытворчых саюзаў (г. зн., пры кожным саюзе) і ўваходзяць у акруговыя т-вы.

На запытаньне, ці патрэбны рабочыя т-вы дапамогі ў раёнах, тав В. адказвае, што яны бязумоўна патрэбны, бо ў раёнах ёсьць у сярэднім 700-800 членаў прафсаюзаў.

У асноўным нельга не згадзіцца з адзначэньнем тых недахопаў, якія існуюць у рабоце і арганізацыйнай структуры шэфскіх т-ваў, асабліва ў адносінах дапамогі прафарганізацый, але я з усёй катэгарычнасьцю выступаю супроць рэвізіі пастановы XVI партканфэрэнцыі, прынятай на дакладу тав. Калініна.

Тав. В. раіць нам рэарганізаваць шэфтаварыствы ў рабочыя т-вы дапамогі калектывізацыі (простымі словамі. распусьціць шэфтаварыствы і арганізаваць ўзмацніць работу шэфскіх т-ваў, перайсьці да арганізацыі раду добраахвотных аб'яднаньняў і партыйных, і прафэсыянальных, і ўсякіх іншых фабрычна-заводзкіх)... павінны быць арганізаваны т-вы дапамогі калектывізацыі зямляробства».

І вось калі прадумаеш тое, што раіць тав В., і тое, што сказана ў пастановах XVI партканфэрэнцыі, дык зусім відавочна, што пастановы гавораць аб адным, а тав. В. раіць другое.

Яго прапановы дыямэтральна процілеглыя дырэктывам XVI партканфэрэнцыі.

Трэба палажыць канец разважаньням аб «рэарганізацыі» шэфтаварыстваў, бо яны толькі паслабляюць іх работу. Мы павінны сказаць поўным голасам, што шэфтаварыствы застаюцца, але побач з імі мы будзем арганізоўваць раённыя т-вы дапамогі калектывізацыі (РТДК).

У сваім артыкуле тав. В. гаворыць, што членамі РТДК зьяўляюцца ўсе члены саюзу. Я пытаюся: могуць зьяўляцца ці зьяўляюцца? Добраавотна ці абавязкова?

Некалькі слоў наконт арганізацыі рабочых т-ваў у вясковых раёнах. Безумоўна, там, дзе ёсьць прадпрыемствы (Добруш, Чашнікі). рабочыя т-вы павінны быць арганізаваны, але не ў раённым маштабе, а на самім прадпрыемстве. Арганізоўваць РТДК у вясковых раёнах нямэтазгодна.

Апошняе—наконт арганізацыйнай структуры РТДК. Тав. В. прапануе арганізаваць раённыя акруговыя і ўсебеларускае праўленьні РТДК. Прыняўшы гэтыя прапановы, мы-б адразу сталі на няправільны бюракратычны шлях таму, што гэта зьявавала-б праяўленьне ініцыятывы месц.

Я прапаную арганізаваць РТДК на прадпрыемствах, аб'яднаць іх у куставыя праўленьні па адзнацы шэфства над адным і тым-жа вясковым раёнам. Куставое праўленьне павінна ўвязваць работу РТДК з падшэфнымі раённымі і акруговымі арганізацыямі.

Што-ж датычыць усебеларускай арганізацыі, дык яна будзе лішняй пад будовай, якая не дае рэальнай карысьці. Пытаньнем агульнага кіраўніцтва павінна займацца вясковая камісія і ЦК КП(б)Б.

ТАМАШЭЎСКІ.

Ад рэдакцыі: Друкуючы другі артыкул па пытаньні аб новых формах і мэтадах шэфскай работы, рэдакцыя запрашае таварышоў выказацца па гэтым пытаньні на старонках газэты.

Пачаўся суд над забойцай тав. Варавы

Працэс торфмэйстэра акрземаддзелу Насуты, забойцы т. Варавы, і пасобнікаў і Насуты--Парсакова і Вэнэдыктава, які ўчора ўвечары пачаў разглядаць Менскі акруговы суд у клюбе саўгандальслужачых, выклікаў вялікую зацікаўленасьць сярод пралетарскай грамадзкасьці Менску. Заля паседжаньня суду перапоўнена рабочымі і служачымі.

Судовае сьледзтва пачынаецца папярэднім допытам абвінавачаных, пасьля чаго суд пераходзіць да допыту Насуты.

Допыт Насуты працягваўся да позьняй ночы і яшчэ ня скончаны. Сёньня паседжаньне суду пачнецца а пятай гадзіне ўвечары.

***

Склад суду наступны: старшыня—тав. Шлык, засядацелі т. т. Аляшкевіч і Аляхновіч. Дзяржаўнае абвінавачаньне вядзе менскі акруговы пракурор тав. Зысьман. У якасьці грамадзкіх абвінаваўцаў на судзе выступаюць т. т. Будзінскі і Лейвікаў. Абаронцы — Левін і Малкін.

(Працяг прыгаданага — на 2 с.)

ФРУНЗАЎСКІ РАЙКОМ КП(б)Б
СКЛІКАЕ на 26 сьнежня а 6 гадз. увеч. НАРАДУ
ЯЧЫЭЙКАВЫХ УПОЎНАВАЖАНЫХ „ЗЬВЯЗДЫ"
па пытаньні спаборніцтва па падпісцы на „Зьвязду" ў раёне і ячэйках і інш.
Упоўнаважаныя ад партыйных і іншых сходаў вызваляюцца.
Нарада адбудзецца ў памяшканьні АПА райкому.
Фрунзаўскі райком КП(б)Б.

пытаньня ў Савецкім Саюзе, аб фактычным зьнішчэньні няроўнасьці паміж працоўнымі розных нацыянальнасьцей у галіне эканамічнай, культурнай і г. д. Якраз цяперашнія тэмпы індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі патрабуюць узмацненьня работы ў гэтай галіне і зусім ня зьнімаюць яе з чаргі.

Якраз цяперашняе міжнароднае становішча Савецкага Саюзу патрабуе сваю чаргу ўзмацненьня ўвагі прав

На шляхох да новага быту

Калектыў з сем'яў вайсковых служачых

44 сям'і камандна - палітычнага складу часьцей Менскага гарнізону, якія жывуць у доме № 61 (Савецкая вул.), пастанавілі на агульным сходзе арганізаваць калектыў. На сходзе таксама вырашана ўжо некальні прынцыповых пытаньняў, як калектыўнае харчаваньне, закупка дроў, плата за электрычнасьць, ваду, арганізацыя дзіцячага пакою і інш. Сход даручыў асобнай камісіі распрацаваць статут гэтага калектыву і плян канкрэтнае работы. Усе ўдзельнікі сходу выказаліся за тое, каб кожны член калектыву ўносіў у калектыў ня менш 50 проц. свайго месячнага заработку, ня гледзячы на разьмер сваёй пэнсіі і ліч членаў сям'і. Гэта дасьць магчымасьць шматсямейным членам харчавацца на аднолькавых правах з маласямейнымі.

Ашчадныя касы ў калгасах і саўгасах

У мэтах выкананьня дырэктывы ЦК КП(б)Б аб прыстасаваньні сеткі ашчадных кас да абслугоўваньня сацыялістычнага сэктару вёскі, Галоўная ашчадная каса прыступіла да арганізацыі раённых аддзяленьняў ашчадных кас у 25 раёнах БССР. У першую чаргу, гэтыя аддзяленьні будуць арганізаваны ў раёнах суцэльнай калектывізацыі.

У буйных калгасах і саўгасах таксама арганізуюцца ашчадныя касы, пры чым у некаторых з іх уводзяцца штатныя адзінкі.

Пытаньні ашчаднай справы будуць уключаны ў праграму курсаў для падрыхтоўкі рахункаводаў у калгасах.

У Чырвоным Крыжы

Улічваючы неабходнасьць больш паскоранай падрыхтоўкі нізавых медычных кадраў, ЦК Бел. т-ва Чырв. Крыжу прызнаў патрэбным скараціць тэрмін навучаньня ў школах сёстраў з 3-х да 2-х год. Гэтае скарачэньне адбудзецца за лік ушчыльненьня праграмы і навучальнага дня. У надыходзячым 1930 годзе адбудуцца 2 выпускі медсёстраў: першы выпуск у маі месяцы, а другі — у ліпені. Усяго-ж гэтыя два выпускі дадуць 162 чал.

* * *

Па акругах арганізуюцца месячныя курсы першае дапамогі. На курсы будуць залічаны калгасьніцы, саўгасьніцы і батрачкі. Мэта курсаў — арганізаваць актыў чырвонага крыжу ў аграмаджаным сэктары вёскі і падача першае дапамогі.

* * *

ЦУ Бел. т-ва Чырв. Крыжу распачаў падрыхтоўку экспанатаў на сусьветную выстаўку, якая адбудзецца ў г. Дрэздэне ў 1930 годзе. На выстаўцы будуць прадстаўлены экспанаты па пытаньні аховы здароўя.

Прыступлена таксама да падрыхтоўкі экспанатаў на выстаўку прамысловасьці і сельскае гаспадаркі БССР.

ЗДАРЭНЬНІ

— **Сымуляцыя пакражы.** Халопеніцкай райміліцыяй затрыманы прыказчык Латыгаліцкага каапэратыву Сысой, які прысвоіў сабе больш за 300 руб. каапэрацыйных грошай. Дзеля таго, каб захаваць сьляды злачынства, Сысой выламаў вакно ў краме каапэратыву, чым хацеў сымуляваць пакражу з каапэратыву.

За спэкуляцыю дэфіцытнымі таварамі. Крымышук затрымаў Давідава і Рубін Хаю, якія куцілі з крам МЦРК дэфіцытныя тавары і перапрадавалі іх на прыватным рынку.

Усім членам і кандыдатам Мен. АК ЛКСМБ і сакратаром райкомаў і членам рэўкамісіі.

29-га сьнежня 1929 г. а 5-й гадзіне ўвечары адбудзецца

ПЛЕНУМ МЕН. АК ЛКСМБ

З ПАРАДКАМ ДНЯ: 1) аб задачах сацыялістычнай рэканструкцыі с-гаспадаркі у зьвязку з вясеньняй пасеўкампаніяй і ўдзел камсамольскай арганізацыі; 2) аб растлумачэньні сутнасьці гаспазарчых пяцігодкі; 3) арганізацыйныя пытаньні.

МЕН. АК ЛКСМБ.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому выяжджае ў г. Барысаў

Сёньня ўвесь склад прэзыдыуму Менакрвыканкому выяжджае ў гор. Барысаў, дзе правядзе сумеснае пасяджэньне з пленумамі Барысаўскага райвыканкому і гарсавету. На пасяджэньні будзе заслухана справаздача Барысаўскага РВК.

Рабочы спорт

Фізкультура не пераведзена на новыя рэйкі

Адбылося пасяджэньне часовага бюро фізкультуры пры культаддзеле ЦСПСБ. Бюро ўстанавіла, што рад саюзаў яшчэ не разгарнуў, як належыць, фізкультурнай работы. Слаба праводзіцца кампанія перавыбараў гурткоў і падрыхтоўка да ўсебеларускай канфэрэнцыі прафсаюзных працаўнікоў фізкультуры.

Члены бюро фізкультуры выяжджаюць ва ўсе акругі Беларусі, дзе практычна дапамогуць мясцовым прафарганізацыям у рэарганізацыі фізкультурнай работы.

Спаборніцтва па стральбе

У ціры «Дынама» распачынаецца спаборніцтва па лепшай стральбе з малакаліберная вінтоўкі. У спаборніцтвах прымаюць удзел асоавіяхімаўскія ячэйкі польпэдтэхнікуму, камвузу, беларускага і яўрэйскага пэдтэхнікумаў. Умовы спаборніцтва — стральба на 25 мэтраў, лежачы бяз упору.

Паведамленьні

Дом Камасьветы 24-га сьнежня ў пакоі № 19 (уваход з вул. Энгельса) праводзіць групавую кансультацыю для партактыву гор. Менску на тэму: «Аб правах правага ўхілу ў яўрабоце». Кансультант — тав. Ашаровіч. Пач. у 19 гадзін. Уваход па партбілетах.

Дом Камасьветы. 24-га сьнежня ў 19 гадз. — выбары 2-га групкому саюзу працасьветы і перавыбары рэўкамісіі. Яўка асьветнікаў абавязкова.

Фрунз. РК. 23-га сьнеж. пашыр. пасяджэ. прэз. райсавету Асоавіяхіму. Пач. у 19 гадз. Прысут. чл. і канд. райсавету абавяз.

— У панядзелак 23-XII а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ адбудзецца нарада па пытаньню выкананьня пастановы Лістападаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы кадраў. На павестцы дню стаяць пытаньні: 1. Інфармацыя НКА аб мерапрыемствах па выкананьню пастановы Лістападаўскага Пленуму ЦК аб падрыхтоўцы кадраў і 2. Інфармацыя калектыву ЛКСМБ БДУ і ўсіх Тэхнікумаў.

На нараду запрашаюцца: бюро калектыву ЛКСМБ БДУ, Палітэхнікум, Белпэдтэхнікум і ўсе пэдтэхнікумы, сакратары вытворчых ячэек «Бальшавік», «Энэргіі», «Камунар», «Меншвэй», вагонных майстэрань, Белгосстрой, «Пралетары», прадстаўнікі НКА, АКРАНА, ЦСПСБ, ВСНГБ, Праўленьня БДУ, Палітэхнікуму і ўсіх Пэдтэхнікумаў.

Усе прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ у ЦП Саюзаў.

ЦК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1930 ГОД

на старэйшую ў БССР вялікую штодзенную газэту

ЗЬВЯЗДА

ЦЭНТРАЛЬНЫ ОРГАН КП(б)Б. XIV ГОД ВЫДАНЬНЯ.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

	12 мес.	6 мес.	3 мес.	1 мес.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА	9 р. 75 к.	5 р. — к.	2 р. 60 к.	— р. 90 к.

„ЗЬВЯЗДА" дае сваім падпісчыкам дадаткамі на ільготных умовах наступныя часопісі:

НОВУЮ 2-х тыднёвую партыйную часопісь (орган ЦК КП(б)Б) ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК

«Парт. Работнік» будзе выходзіць замест часопісі «Весткі ЦК КП(б)Б» і «У дапамогу партучобе».

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 месяц—15 кап. (замест 25 кап.)

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 м.—20 к. (замест 35 к.)

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

Падпісная цана: на год—1 руб. замест звычайнай цаны 3 руб.; на 6 мес.—75 кап., на 3 мес.—50 кап.

ОГОНЕК

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на «ЗЬВЯЗДУ» з часопісьсю «ОГОНЕК» на 1 м.—1 р. 10 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: галоўнай канторай «ЗЬВЯЗДЫ» (Менск, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльнымі ўпоўнаважанымі.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

З панядзелка, 23 сьнежня

выключны дакументальны фільм

Шпікі, спэкулянты, зладзеі, бандыты, растратчыкі і контрэвалюцыянэры ізалюцца на Салавецкія выспы Белага мора.

выключны дакументальны фільм

Задача лягераў— перавыхаваць з сацыяльна-шкодных людзей — карысных членаў грамадзтва.

САЛАЎКІ

(Салавецкія лягеры асаблівага прызначэньня)

у 7-мі частках.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ часопісь „СОВКИНО" № 69

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. Каса адчынена ад 5 гадз.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІЯНЭР".

(Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»).

Ад панядзелка, 23-га сьнежня

цікавы фільм вытворчасьці «САВКІНО»

АДАРВАНЫЯ РУКАВЫ.

Кіно-навэля ў 6 частк.

КАСА адчынена штодня ад 2 гадз. дня.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Сёньня 23 сьнежня. Клюб імя Карла Маркса Сёньня 23 сьнежня.

Апошні канцэрт вядомага дзяржаўнага

ВАКАЛЬНАГА КВАРТЭТУ імя ЛЫСЕНКА (Украіна).

У складзе А. Шэпэткоўскага (тэнор), І. О. Трацьцяка (тэнор), М. Р. Беспалава (барытон), В. Дзехцярова (бас).

У ПРАГРАМЕ: украінскія рэвалюцыйныя, народныя і бытавыя сьпевы, казацкія думы, сьпевы народаў СССР на расійскай, беларускай, яўрэйскай, татарскай, грузінскай і інш. мовах, а таксама творы еўрапэйскіх кампазытараў.

Пачэтак а 8 гадз. 30 мін. увечары.

Білеты ў рабочай касе ад 12 да 2 гадз. і ад 4 да 6 гадз. увечары, ад 6 гадз. да пачатку канцэрту ў касе клюбу.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

АЎТОРАК, 24 сьнежня, для фабкому 1-й друкарні. Білеты ў фабкоме.

Ц. Даўгапольскі БАРАЦЬБА МАШЫН

Пачатак а 8 гадз. 30 мінут.

КІНО СПАРТАК ад панядзелка, 23 сьнежня

звыш праграмы гастролі артысткі Ленінградз. тэатраў Е. Г. ГЕОРГІЕВАЙ на экране выдатны замежны фільм ПАЛКАЕ ЮНАЦТВА у 7 част.

Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 30 м. Каса—ад 5 г.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

Ад панядзелка, 23 сьнежня

ЛЕПШЫ ФІЛЬМ —— САВЕЦКАЙ ВЫТВОРЧ.

АБЛОМАК ІМПЭРЫІ

у 6-ці эпізодах

Галоўныя ролі выконваюць: Л. СЯМЁНАВА, Ф. КІНІЦІН, Я. ГУДКІН, В. САЛАЎЦОЎ і інш.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: КІНО-ХРОНІКА САЎКІНО № 61

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч. КАСА адчынена ад 5½ гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Ад пятніцы, 20 сьнежня новы мастацкі фільм вытворчасьці Межрабпом-фільм

ЧЫНЫ І ЛЮДЗІ (ЧЭХАЎСКІ АЛЬМАНАХ)

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: кіно-хроніка Савкіно № 67

Пачатак сэансу а 7 гадзіне

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1930 год

„УЗВЫШША"

Выйшаў з друку, прадаецца і № 8 рассылаецца падпісчыкам часопісі «УЗВЫШША»

У нумары:

С. Дарожны—У трынаццаты рэйс (верш),
Кузьма Чорны—Лявон Бушмар (аповесьць).
Максім Лужанін—Дваццаць чатыры гадзіны (верш).
Лучаш Калюга—Тахвілін швагер (апавяданьне).
Ф. Купцэвіч—Пра творчасьць М. Зарэцкага.
К. Чорны—Заўвага да перакладаў мастацкае літаратуры.
М. Бардон—Колькі заўваг пра некаторыя словы.
М. Когем—Этымалёгічныя нататкі.
А. Цітоў—«Кропівина байка».
Г. Яруш—«Білий вовк»—Пятра Панча.

Друкуецца і хутка выйдзе № 9-10 часопісі.

Падпіска прымаецца ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі, усімі аддзяленьнямі выдавецтваў, упоўнаважанымі рэдакцыі і ў рэдакцыі часопісі «Узвышша»—Дом пісьменніка, Савецкая, 68.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

ІЛЮСТРАВАНАЯ ДВУХТЫДНЕВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адказны рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ

24 НУМАРЫ У ГОД

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе высьвятляць у мастацкім слове і багатай ілюстрацыі рост і разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва БССР і ўсяго Савецкага Саюзу, рэканструкцыю народнае гаспадаркі, посьпехі індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, шляхі культурнае рэвалюцыі.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе знаёміць чытача з рэвалюцыйнымі падзеямі ўсяго сьвету, а таксама і з важнейшымі зьявішчамі сусьветнай эканомікі і культуры.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" зьмяшчае: апавяданьні, вершы, нарысы, падарожжы, фэльетоны, артыкулы з палітычнага, эканамічнага, культурнага і мастацкага жыцьця. Мастацкія навінкі, ілюстрацыі, рэпрадукцыі карцін выдатнейшых мастакоў, а таксама гумарэскі, пародыі, старонкі сатыры і гумару з адпаведнымі шаржамі і карыкатурамі.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе адлюстроўваць усё бягучае жыцьцё мастацтва як савецкага, так і сусьветнага, найбольш буйныя зьявішчы літаратуры, тэатру і кіно.

Часопісь „ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе ўва ўсіх кнігарнях БДВ, кнігарнях ЦРК, кіёсках контрагенцтва друку і выдав. „Правда", чыгуначных кіёсках, паштовых кіёсках і ўсіх газэтаносцаў ува ўсіх гарадох, мястэчках БССР.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА 1930 Г.

На 1 год . . . . . 3 руб. —
На паўгода . . . . . 1 руб. 50 к.
На 3 месяцы . . . . — 75 к.

Цана аддзельнага нумару 15 к.

№ 1 ВЫЙДЗЕ 1 СТУДЗЕНЯ 1930 г.

ПАДПІСКУ ПРЫМАЮЦЬ:

Бюро падпіскі БДВ (Менск, Савецкая 63), Цэнтральная кнігарня БДВ, усе акруговыя аддзяленьні БДВ, кнігарні ЦРК, кіёскі контрагенцтва друку, Беларускае газэтнае бюро, усе паштовыя аддзяленьні, усе ЛІСТАНОСЦЫ ЯК У ГАРАДОХ, ТАК І У ВЁСКАХ І АСОБЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПАСЬВЕДЧАНЬНІ.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК ЛКСМБ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

ПАДПІСКА НА УСЕ ВЫДАНЬНІ на 1930 г.

АДЧЫНЕНА

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

орган ЦК і МК ЛКСМБ

штодзённая газэта рабоча-сялянскай моладзі.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

Без дадаткаў:		З дадаткамі:	
1 год	3 р. 30 к.	«Маладняк»	6 р. 10 к.
		«Шляхі калектывізацыі»	4 р. 80 к.
		«Чырвоная Беларусь»	5 р. 50 к.
6 м-цаў	1 р. 80 к.	«Маладняк»	3 р. 30 к.
		«Шляхі калектывізацыі»	2 р. 70 к.
		«Чырвоная Беларусь»	3 р. —
3 м-цы	— 90 к.	«Маладняк»	1 р. 65 к.
		«Шляхі калектывізацыі»	1 р. 35 к.
		«Чырвоная Беларусь»	1 р. 50 к.
1 м-ц	— 30 к.	«Маладняк»	— 55 к.
		«Шляхі калектывізацыі»	— 45 к.
		«Чырвоная Беларусь»	— 50 к.

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

„ПІОНЭР БЕЛАРУСІ"

орган ЦК ЛКСМБ і ЦБ ЮП

выходзіць 2 разы ў тыдзень

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

12 м-цаў	1 р 20 к.
6 м-цаў	— 60 к.
3 м-цы	— 30 к.
1 м-ц	— 10 к.

„ЮНГЕР АРБЭТЭР"

орган ЦК ЛКСМБ—

выходзіць 2 разы ў тыдзень

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

1 год	1 р. 80 к.
6 м-цаў	— 90 к.
3 м-цы	— 45 к.
1 м-ц	— 15 к.

„ІСКРЫ ІЛЬЛІЧА"

дзіцячая часопісь

Выходзіць 1 раз у месяц.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

1 год	1 р. 80 к.
6 м-цаў	— 90 к.
3 м-цы	— 45 к.
1 м-ц	— 15 к.

Часопісь „МАЛАДНЯК" орган БелАПП, штомесячная, літаратурна-мастацкая і грамадзка-палітычная часопісь.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

1 год	3 р. —
6 м-цаў	1 р. 60 к.
3 м-цы	— 90 к.
1 м-ц	— 30 к.

„ЮНГЕР ЛЕНІНЕЦ"

орган ЦБ ЮП—

выходзіць 1 раз у тыдзень.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

1 год	1 р. 20 к.
6 м-цаў	— 60 к.
3 м-цы	— 30 к.
1 м-ц	— 10 к.

Падпіска прымаецца ўва ўсіх паштовых канторах, аддзяленьнях, агэнцтвах, кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, у кіосках Контрагэнцтва Друку, усімі лістаносцамі, яч. упаўнаважанымі па «Чырвонай Зьмене»

Да ведама ўсіх рахунковых працаўнікоў

ПРЫЁМ ПАДПІСКІ

)—(НА ЧАСОПІСІ:)—(

„СЧЕТОВОДСТВО", „СЧЕТНАЯ МЫСЛЬ", „СПУТНИК СЧЕТОВОДА" І „ІГБЭ"

ПРАЗ Рэсп. Бюро АРУ

СПЫНЯЕЦЦА 28-XII 29 г.

ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ на часопісі значна зьніжаны.

Усім членам АРУ скідка 10 проц.

ПАДПІСКА прымаецца ў цэнтральнай АРУ (Савецкая, 65)

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляў усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй на ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з яких 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна у па чатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дэсэсацыяванымі марк.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, баграхунак № 68... Усе карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усекабанк. Завочныя курсы.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяніце на тел. 7-81

Прыглядзіўся собр